Умова паспяховай працы

СТАР. 2



Лепшы рэгіён для бізнесу

СТАР. 3

Народнае — значыць жывое

СТАР. 7

Родная газета на роднай мове

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

ЗВЯЗДА

10 ЧЭРВЕНЯ 2014 г. АЎТОРАК № 106 (27716) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЖЫВАЯ ПАМЯЦЬ

Дэмакратыя, якая дапускае абяленне нацызму, непрымальная

Фота БЕЛТА.

Святым маральным абавязкам людзей, якія жывуць цяпер, перад загінулымі і святым абавязкам перад будучымі пакаленнямі з'яўляецца недапушчэнне рэабілітацыі нацыстаў і іх паслугачоў. Аб гэтым Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка заявіў на цырымоніі закладкі памятнай капсулы на месцы стварэння мемарыяльнага комплексу «Трасцянец».

«Здавалася б, генацыд павінен навечна застацца ў памяці чалавецтва, а на вірус карычневай чумы выпрацавацца ўстойлівы імунітэт. На жаль, гэтага не адбылося, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Сёння фашызм зноў падымае галаву. Некаторыя палітычныя сілы спрабуюць абяліць нацызм, выкарыстоўваюць нацысцкую атрыбутыку, сімволіку, лозунгі. У адпаведнасці са сваімі карыслівымі інтарэсамі перапісваюць вынікі Другой сусветнай вайны». «Асобныя замежныя палітыкі пераконваюць нас, што ўсё гэта — права на свабоду думкі і праява дэмакратыі. Мы такой дэмакратыі не прымаем», — падкрэсліў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка перакананы, што тыя краіны, якія грэбуюць ўрокамі гісторыі, паблажліва ставяцца да праяў расавай і нацыянальнай нецярпімасці, прапагандзе ідэй перавагі адных народаў над іншымі, асуджаны на паўтор трагедыі, але ўжо на сваёй зямлі і ў сваіх дамах.

«Мы абавязаны захаваць і перадаць нашчадкам памяць аб ахвярах Другой сусветнай вайны, страшныя падзеі якой ніколі не павінны паўтарыцца. Наш святы дэвіз — «Ніхто не забыты, нішто не забыта!». Менавіта таму мы прынялі рашэнне стварыць тут, у Трасцянцы, мемарыял», — сказаў кіраўнік дзяржавы, адзначыўшы, што мемарыял павінен стаць аб'ектам агульнаеўрапейскага значэння, раскрываючым антычалавечую сутнасць нацысцкай палітыкі ў дачыненні да мірнага насельніцтва Еўропы. «Гэта будзе даніна памяці тым пакаленням, на якія абрынуліся ўсе нягоды і выпрабаванні XX стагоддзя, месца пакланення ўсіх людзей, якім дарагія каштоўнасці гуманізму і мірная будучыня», — сказаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што канцлагер у Трасцянцы быў самым буйным на тэрыторыі Савецкага Саюза і стаіць у адным чорным шэрагу з Асвенцымам, Майданэкам, Трэблінкай. Тут фашысты знішчылі больш за 200 тысяч чалавек розных нацыянальнасцяў: славян, яўрэяў, цыганоў і многіх іншых.

СТАР. 2

ДА ВЕДАМА ЧЛЕНАЎ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

12 чэрвеня 2014 года ў 11.00 у зале пасяджэнняў Савета Рэспублікі (вул. Чырвонаармейская, 9) адбудзецца чарговае пасяджэнне чацвёртай сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пятага склікання.

СУКВЕЦЦЕ КУЛЬТУР — СУЛАДДЗЕ ЖЫЦЦЯ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Заключны этап юбілейнага, X Рэспубліканскага фестывалю нацыянальных культур быў ушанаваны нават «нябеснай канцылярыяй». Калі ў першы дзень без дажджу ўсё ж не абышлося, то два наступныя парадавалі тысячы гродзенцаў і гасцей горада над Нёманам цудоўным сонечным надвор'ем, якое выдатна гарманіравала з вельмі насычанай і разнастайнай праграмай свята.

Дарэчы, да паслуг турыстаў у Гродне ўстаноўлены інфармацыйныя знакі, якія ўказваюць дарогу да гісторыка-культурных, архітэктурных славутасцяў. А многае і не трэба было прыдумваць спецыяльна да свята. Па традыцыі, напрыклад, штодзённа ў 12 гадзін трубач з пажарнай каланчы на вуліцы Замкавай быццам сігналізуе: «У горадзе ўсё спакойна». Так, дарэчы, і называецца адна з кампазіцый, якую выконвае музыкант у касцюме пажарнага XIX стагоддзя.

Што не ўбачыш нідзе, а толькі на фестывалі ў Гродне — гэта, безумоўна, нацыянальныя падворкі. Сёлета іх было 22 — далучыліся англічане, балгары, іспанцы, італьянцы, крымскія татары. Мы пабывалі ўсюды і ніводны падворак не захацелася адразу ж пакінуць, бо на кожным чакала нейкая цікавінка. Літоўскі падворак упрыгожылі гірляндамі з галінак нацыянальнага дрэва — дуба, а ўсім наведвальнікам дарылі сцяжкі і стужачкі з сімволікай Літвы і фестывалю. На польскім — запрашалі прадэгуставаць нацыянальныя стравы — флякі, бігос, рыбу па-варшаўскі. На яўрэйскім — гасцей частавалі мацой (тонкімі праснакамі з пшаніцы), узнагароджвалі сувенірамі пераможцаў віктарыны па тэме гісторыі і традыцый яўрэйскага народа. На грузінскім — да свята абнавілі падзеху (нацыянальную летнюю кухню) і выпеклі вялізны торт у выглядзе сваёй гістарычнай радзімы з яе рэкамі, гарамі і паселішчамі.

СТАР. 2

ЛІЧБА ДНЯ

30 тон за суткі

— пачатковы дэбіт новай нафтавай свідравіны ў Хойніцкім раёне. Новая залеж на глыбіні 4236-4241 м знойдзена падчас даразведкі пры засваенні саргаеўскага гарызонта Заходне-Калінінскага радовішча, які быў адкрыты летась. Прабураная свідравіна дапамагла спецыялістам удакладніць яе будову, пацвердзіць наяўнасць залежаў нафты ў сямілукскіх адкладах. Дарэчы, у Беларусі сёння ў распрацоўцы знаходзіцца больш за 60 радовішчаў нафты. Агульны фонд свідравін складае амаль тысячу адзінак, у іх ліку больш як у 700 вядзецца здабыча нафты.

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 10.06.2014 г.

Долар ЗША	10130,00	■
Еўра	13830,00	▲
Рас. руб.	295,00	▲
Укр. грыўня	860,30	▲

НАДВОР'Е СЁННЯ

Брэст	+26°
Віцебск	+21°
Гомель	+23°
Гродна	+25°
Магілёў	+22°
Мінск	+23°

РОЛЯ СУМЛЕННАГА СЛОВА

Удзельнікам IX Беларускага міжнароднага медыяфоруму «Партнёрства ў імя будучыні: рэаліі глабальнага свету»

Паважаныя сябры!

Сардэчна вітаю вас на IX Беларускім міжнародным медыяфоруме «Партнёрства ў імя будучыні: рэаліі глабальнага свету».

Правядзенне сёлетняга форуму напярэдадні 70-годдзя вызвалення Беларусі ад фашысцкіх захопнікаў глыбока сімвалічна. Мы змаглі выстаяць у той страшнай вайне дзякуючы адзінству і стойкасці савецкага народа, яго гатоўнасці адстаяць незалежнасць і шчаслівую будучыню Айчыны.

Сёння ва ўмовах глабальнай інфармацыйнай прасторы асабліва запатрабавана адказная, сумленная журналістыка. Ваша слова павінна збліжаць дзяржавы і народы, процістаяць заклікам да разладу і варожасці, садзейнічаць наладжванню канструктыўнага дыялогу ў імя стварэння і міру.

Жадаю ўсім удзельнікам і гасцям медыяфоруму плённай працы, цікавых сустрэч і новых перспектыўных ідэй.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Супраць выклікаў глабальнага свету

■ Медыяпрастора

У Мінску адкрыўся IX Беларускі міжнародны медыяфорум «Партнёрства ў імя будучыні: рэаліі глабальнага свету». Сёлета ў ім прымае удзел каля 500 чалавек з 26 краін.

У рамках форуму пройдуць самыя розныя мерапрыемствы — ад эксперт-сесій да «Летняй школы журналістыкі», на якой ахвотныя змогуць наведаць майстар-класы вядомых рэпарцёраў, вядучых, аналітыкаў краін блізкага і далёкага замежжа.

Лілія АНАНІЧ, першы намеснік міністра інфармацыі Рэспублікі Беларусь, падчас учарашняй размовы з журналістамі заўважыла, што пад медыяфорумам трэба разумець сур'ёзнае абмеркаванне актуальных праблем развіцця сучаснага свету. «На пленарным пасяджэнні мы чакаем змястоўных дыскусій па тэме геапалітыкі, сусветнай эканомікі, журналістыкі», — заявіла яна. Лілія Ананіч лічыць, што ў сённяшніх умовах СМІ павінны аб'яднаць свае намаганні па замацаванні гуманітарнага супрацоўніцтва і накіраваць іх на рашэнне самых складаных задач.

Першы намеснік міністра інфармацыі таксама акцэнтавала ўвагу на тым, што далёка не заўсёды масмедыя служаць мірным мэтам. «На жаль, сёння СМІ з дапамогай новых тэхналогій часта ўключаюцца ў інфармацыйныя войны. Думаю, на форуме ў Мінску пойдзе сумленная, шчырая, адкрытая размова пра журналістаў, ролю журналістыкі, неабходнасць падаваць праўдзівую інфармацыю, якая служыла б умацаванню ўзаемаразумення, міру, дружбы паміж народамі», — выказала спадзяванні Лілія Ананіч.

Беларускі міжнародны медыяфорум — унікальны праект на прасторы СНД. Ён праводзіцца штогод, пачынаючы з 2006 года. За гады свайго існавання форум стаў знакавай пляцоўкай для абмену думкамі, выпрацоўкі новых ідэй і канцэпцый з удзелам экспертаў у галіне сродкаў масавай інфармацыі па важнейшых праблемах сучаснасці. Яго тэматыка закранала самыя розныя праблемы — сацыяльную адказнасць СМІ, ролю масмедыя як сродку прадухілення выклікаў і пагроз XXI стагоддзя, гісторыка-культурную спадчыну як фактар яднання... Сярод пытанняў, якія абмяркуюць эксперты сёлета, вылучаюцца наступныя: «Суверэнізацыі і інтэграцыя. Еўразійскі эканамічны саюз як платформа стварэння новага свету», «Сусветная камунікацыя ў кантэксце шматпалярнага свету», «Выклікі і пагрозы XXI стагоддзя. Роля міжнароднай супольнасці ў прадухіленні канфліктаў і войнаў».

Надзея ЮШКЕВІЧ.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ПАБЛІЗУ УКРАІНЫ ПАЧАЛІСЯ БУЙНЫЯ ВУЧЭННІ НАТА

У краінах Балтыі пад эгідай ЗША пачаліся вайсковыя вучэнні сухапутных і паветраных сіл НАТА. Манеўры з кодавай назвай Saber Strike («Удар шаблі») будуць ажыццяўляцца па 21 чэрвеня. У іх задзейнічаны каля пяці тысяч вайскоўцаў з Латвіі, Літвы, Эстоніі, Канады, Даніі, Фінляндыі, Нарвегіі, Вялікабрытаніі і ЗША, а таксама 800 адзінак ваеннай тэхнікі. Вучэнні праходзяць на тэрыторыі Латвіі, на палігоне Адажы, а таксама ў Літве, на палігоне Гайжуну ў Рукле. У Літве будуць трэніравацца каля 2600 вайскоўцаў. Цяперашнія манеўры — найбуйнейшыя міжнародныя ваенныя вучэнні ў гісторыі краін Балтыі.

АД ПАВОДКІ Ў БРАЗІЛІІ ПАЦЯРПЕЛІ ДЗЯСЯТКІ ТЫСЯЧ ЧАЛАВЕК

Дзевяць чалавек загінулі ў выніку паводкі ў бразільскім штаце Парана, сталіца якога — Курыціба — будзе адным з месцаў правядзення чэмпіянату свету па футболе, што стартуе праз два дні. У выніку паводкі, як заявілі ва ўрадзе Параны, пацярпелі 48 тысяч чалавек, якія жывуць пераважна ў цэнтральнай частцы штата. На Курыцібе таксама абрынуліся дажджы, аднак моцных разбурэнняў удалося пазбегнуць. Губернатар штата Бета Рыча паведаміў, што ад стыхіі пацярпелі 70 муніцыпалітэтаў. Улады плануюць увесці там надзвычайнае становішча. Сіноптыкі між тым папярэджваюць, што дажджы спыняцца не раней за панядзелак.

МОСТ МАСТАЦТВАЎ У ПАРЫЖЫ НЕ ВЫТРЫМАЎ ЦЯЖАРУ «КАХАННЯ»

У Парыжы абрынуўся славуты мост Мастацтваў, не вытрымаўшы цяжару тысяч «замкоў кахання», пакінутых турыстамі, піша Daily Mail. Падчас абвальвання ад моста адкалолася металічная рашотка, якая па шчаслівай выпадковасці ўпала ўнутр, а не ў Сену. Па словах прадстаўнікоў мясцовай паліцыі, калі б рашотка ўпала на лодкі, вынікі маглі б быць катастрафічнымі. Паведамляецца, што сярод мінакоў, якія знаходзіліся на месце Мастацтваў у момант абвалу, пацярпелых няма. Французскай паліцыі ўдалося своечасова эвакуяваць людзей. Зараз мост перакрыты. Мост Мастацтваў, які быў пабудаваны па загадзе Напалеона ў 1801-1804 гадах, з'яўляецца ўлюбёным месцам не толькі турыстаў, але і саміх парыжан.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

ТАМАТЫ ВЫРАТУЮЦЬ СЭРЦА І ЗАСЦЕРАГУЦЬ АД МАРШЧЫН

Спецыялісты раяць часцей іх дадаваць у розныя стравы, бо, напрыклад, лікапін з таматаў прадухіляе развіццё раку нырак у жанчын, перадае The Health Site. Актыўнае спажыванне лікапіну зніжае рызыку раку на 45%. Акрамя лікапіну, у таматах шмат антыаксідантаў і супрацьзапаленчых злучэнняў. Яны абараняюць ад анкалагічных захворванняў за кошт барацьбы з пашкоджаннямі і свабоднымі радыкаламі. Яшчэ таматы ратуюць ад хвароб сэрца. Яны змяшчаюць вітаміны і рэчывы, якія перашкаджаюць утварэнню халестэрынавых бляшак. Пры гэтым таматы вылучаюцца нізкай каларыйнасцю і высокай колькасцю клятчаткі. Гэта дапамагае здаволіць голад і наладзіць стараванне. Свабодныя радыкалы пагражаюць не толькі захворваннямі на рак, але і новымі маршчынамі. Антыаксіданты ў таматах адцягваюць час з'яўлення маршчын.

КАРОТКА

У Гомельскай вобласці адкрыты новыя паклады нафты. Насычаны вуглевадароднай сыравінай пласт выяўлены ў паўднёвай частцы рэгіёна.

Жылыя дамы па дзяржзаказе будуць будавацца для сем'яў, якія маюць права на дзяржаўную падтрымку ў выглядзе льготных крэдытаў і субсідый, з гэтага года. У 2015 годзе ў Мінску запланаваны ўвод у эксплуатацыю 14 такіх дамоў, у 2016-м — 9 дамоў.

Беларусь запросіць місію МАГАТЭ для аналізу пляцоўкі БелАЭС. Аб гэтым паведаміла першы намеснік міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Беларусі Ія Малкіна.

Алфёраўскі фонд і Нацыянальная акадэмія навук Беларусі заснавалі прэмію для маладых навукоўцаў. Яна будзе прысуджацца за навуковыя працы ў галіне прыродазнаўчых навук па абвешчанай Алфёраўскім фондам і НАН намінацыі. На саісканне прэміі можа быць прадстаўлена праца аднаго аўтара ці групы аўтараў у складзе не больш за тры чалавекі. Памер прэміі складзе $2,5 тыс.

■ Надвор'е

ДАЖДЖЫ І ВЕТРАНА

А на выхадныя пахаладае да плюс 10-17

З першых дзён тыдня на тэрыторыю нашай краіны пачнуць паступаць няўстойлівыя паветраныя масы з боку Балтыйскага мора, паведаміла рэдакцыі спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга ФЯДОТАВА.

Таму ўжо ў аўторак, пераважна па паўночным усходзе, пройдуць кароткачасовыя дажджы і часам навальніцы. Максімальная тэмпература паветра ўдзень складзе ад плюс 20 градусаў па паўночным усходзе да 27 цяпла па паўднёвым захадзе краіны. Уначы ў сераду ў асобных раёнах, а ўдзень па паўднёвым усходзе чакаюцца непрацяглыя дажджы і навальніцы. Удзень на поўдні магчыма ўзмацненне ветру парывамі да 15-18 м/с. Тэмпература паветру ўначы стане 8-15 цяпла, а ўдзень ад плюс 19 па паўночным усходзе да 27 градусаў па паўднёвым захадзе краіны.

Уначы на чацвер будзе пераважна без ападкаў, але ўдзень атмасферны фронт з боку Польшчы прынясе да нас кароткачасовыя дажджы і месцамі навальніцы. Раніцай магчымы слабы туман. Тэмпература паветра ўначы на чацвер складзе плюс 7-14, удзень — 19-22 цяпла, а ў Брэсцкай і Гомельскай абласцях да плюс 27 градусаў.

Паводле доўгатэрміновых прагнозаў айчынных спецыялістаў, бліжэй да выхадных надвор'е ў нас істотна зменіцца, бо з поўначы Еўропы ў Беларусь завітае сапраўды свежае паветра. У пятніцу паўсюдна пройдуць кароткачасовыя дажджы. Тэмпература паветра ўначы складзе 8-14 цяпла, а ўдзень — ад плюс 15 градусаў па паўночным захадзе да 23 цяпла па паўднёвым усходзе краіны. Прагназуецца, што ў выхадныя стане яшчэ халадней. Будуць ісці кароткачасовыя дажджы, удзень у асобных раёнах моцныя ліўні і сур'ёзныя навальніцы. Паўсюдна парывісты паўночна-заходні вецер. Тэмпература паветра ўначы стане 7-11 цяпла, а ўдзень — плюс 10-17 градусаў, толькі на поўдні да 18-21 цяпла.

Сяргей КУРКАЧ.

АБ ПРЫЯРЫТЭТАХ І ПЕРСПЕКТЫВАХ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка даў інтэрв'ю буйным сербскім сродкам масавай інфармацыі: грамадска-палітычнаму штодзённіку «Палітыка» — найстарэйшай газеце на Балканах, папулярнай у палітычных, дзелавых і акадэмічных колах Сербіі, і дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі «Радыё і тэлебачанне Сербіі» — нацыянальнаму медыяхолдынгу, найбуйнейшаму вяшчальніку на тэрыторыі былой Югаславіі і Балкан.

Кіраўнік дзяржавы адказаў на шырокае кола пытанняў, якія датычыліся прычын устойлівасці сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі на фоне крызісных з'яў у сусветнай эканоміцы, узаемаадносін Беларусі з ЕС і НАТА, стану і перспектыў беларуска-сербскіх адносін, паведамляе БЕЛТА.

Гаворачы аб крытыцы Захаду адносна палітыкі, што праводзіцца ў Беларусі, Аляксандр Лукашэнка адзначыў: «Чаго мне крыўдзіцца на Захад? Я ж разумею, чаго яны хочуць ад мяне і чаго яны хочуць ад Беларусі. Я ніколі на гэта не пайду і не дазволю ім тут гаспадарыць».

«Дзякуючы гэтаму мы неяк развіваемся і больш-менш утрымліваем стабільнасць у краіне. Для мяне значна важней, я часта пра гэта кажу, каб маладая мама выйшла позна вечарам і вывезла на калясцы сваё дзіця, не баючыся таго, што нейкія марадзёры-жывадзёры яе спыняць і будуць здзекавацца. Каб нармальна жылі сем'і, каб нараджалі дзяцей. Для мяне гэта важней, чым паехаць у Еўрасаюз і там паўсміхацца адзін аднаму», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Асобная ўвага падчас інтэрв'ю была нададзена далейшай эвалюцыі Еўразійскага эканамічнага саюза, яго прывабнасці для іншых дзяржаў. Аляксандр Лукашэнка лічыць, што ў новага інтэграцыйнага ўтварэння вялікія перспектывы. Аднак для таго, каб да яго захацелі далучыцца іншыя краіны, ЕАЭС «неабходна прадэманстраваць з пункту гледжання эканомікі нармальныя перспектывы, паказаць усім, што гэта сапраўды жыццяздольнае аб'яднанне».

Аляксандр Лукашэнка таксама выказаў сваё бачанне вытокаў унутрыпалітычнага крызісу ва Украіне.

Пасля інтэрв'ю сербскія журналісты цёпла падзякавалі беларускаму лідару за дапамогу, аказаную Беларуссю ў пераадоленні наступстваў нядаўняй разбуральнай паводкі ў Сербіі.

СУСТРЭЧЫ Ў КІЕВЕ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка прыняў удзел у інаўгурацыі выбранага Прэзідэнтам Украіны Пятра Парашэнкі, падчас якой коратка паразмаўляў з шэрагам кіраўнікоў дзяржаў, што прыбылі на цырымонію. Асабліва цёплыя сустрэчы адбыліся з былымі прэзідэнтамі Украіны Леанідам Краўчуком, Леанідам Кучмам і Віктарам Юшчанкам, паведамляе карэспандэнт БЕЛТА.

Як адзначаюць наглядальнікі, Аляксандр Лукашэнка апошнім пакінуў ложу, дзе знаходзіліся запрошаныя высокія госці і сям'я Пятра Парашэнкі. Прычынай таго была ўвага дэпутатаў Вярхоўнай Рады Украіны да беларускага лідара. Многія з дэпутатаў падыходзілі, каб паціснуць руку і выказаць словы ўдзячнасці.

Потым адбылася імправізаваная 30-хвілінная прэс-канферэнцыя Аляксандра Лукашэнкі. Яго абступілі каля 100 журналістаў з еўрапейскіх і ўкраінскіх СМІ. Беларускі лідар адказаў на ўсе пытанні, якія датычыліся развіцця ўзаемаадносін з Украінай і выбраным прэзідэнтам, а таксама будучага Еўразійскага эканамічнага саюза.

Як адзначаюць наглядальнікі ў Кіеве, меркаванне Прэзідэнта Беларусі наконт сітуацыі ва Украіне, а таксама яго асоба выклікалі высокую цікавасць у журналістаў і палітыкаў.

ЖЫВАЯ ПАМЯЦЬ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

У 1944 годзе войскі, якія вызвалялі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, заспелі попел ад яшчэ не астылых печаў і былі ўражаны бесчалавечнымі злачынствамі, якія тварыліся на працягу некалькіх гадоў у Трасцянцы. «Беларусь, якая страціла за гады вайны кожнага трэцяга жыхара, ніколі не забудзе тых страшных старонак гісторыі», — сказаў беларускі лідар.

Гісторыкамі і архітэктарамі распрацавана маштабная канцэпцыя мемарыяла, выдаткаваны дзяржаўныя сродкі на яго будаўніцтва, паведамляе БЕЛТА. Жаданне ўнесці свой уклад ва ўвекавечанне памяці ахвяр нацызму выказала і міжнародная грамадскасць. У закладзенай памятнай капсуле на месцы будаўніцтва мемарыяльнага комплексу гаворыцца, што ён павінен паслужыць напамінам будучым пакаленням аб трагічных падзеях, якія ніколі не павінны паўтарыцца; стане сімвалам болю і смутку для людзей розных нацыянальнасцяў і веравызнанняў, перасцярогай супраць адраджэння вар'яцкіх ідэй перавагі адных народаў над іншымі.

На мерапрыемстве прысутнічалі нашчадкі вязняў Трасцянца з розных куткоў Беларусі, а таксама з Аўстрыі, Германіі, Ізраіля, Польшчы, Чэхіі, ЗША і іншых краін, замежныя госці, прадстаўнікі дыпкорпуса. У цырымоніі закладкі памятнай капсулы прыняла ўдзел і вучаніца адной з мінскіх школ, чыя прабабуля разам са сваім маленькім сынам была спалена ў Трасцянцы.

«У гэтыя хвіліны агульнага смутку ўсе мы звяртаемся ў думках да светлай памяці кожнага, хто стаў ахвярай нацысцкіх злачынстваў, да нямых ценяў жанчын, мужчын, старых і дзяцей, якія нябачна атачаюць нас тут. І мы цвёрда кажам: «Ніколі больш!» Ніколі не павінны паўтарыцца вар'яцтвы фанатыкаў, ніколі не павінны перамагчы ідэі ксенафобіі, дамінавання і нацыянальнай нецярпімасці», — сказаў беларускі лідар, звяртаючыся да прысутных.

«Мы зробім усё для таго, каб на беларускай зямлі панавалі ўзаемапавага, памяркоўнасць і згода, уладарылі прынцыпы гуманізму і добрай волі», — упэўнены Аляксандр Лукашэнка.

На мерапрыемстве таксама прысутнічаў прэзідэнт Сусветнага яўрэйскага кангрэса Рональд Лаўдэр. «Сёння галоўны ўрок, які ўсе мы павінны засвоіць, гэта тое, што неабходна непрымірыма змагацца з усімі праявамі расізму, антысемітызму, ксенафобіі і нецярпімасці», — сказаў ён на цырымоніі.

У гутарцы з ветэранамі пасля завяршэння цырымоніі Прэзідэнт падкрэсліў, што Беларусь паказвае ўсяму свету прыклад захавання сапраўдных каштоўнасцяў у жыцці людзей. Аляксандр Лукашэнка пажадаў ветэранам яшчэ доўгіх гадоў жыцця і падкрэсліў, што шмат у чым менавіта яны, а не помнікі, спрыяюць перадачы маладому пакаленню памяці пра мінулую вайну і цяжкія пасляваенныя гады. Прэзідэнт таксама адзначыў, што стараецца ініцыяваць будаўніцтва помнікаў, мемарыялаў, і ў тым ліку новага будынка музея Вялікай Айчыннай вайны, «каб людзі, якія прыйшлі нават ужо пасля нас, не забыліся пра тое страшнае гора».

Акрамя таго, Прэзідэнт згадаў пра падзеі ў Еўропе, дзе часам адмаўляюцца і ставяцца пад сумненне традыцыйныя каштоўнасці, руйнуюцца векавыя асновы. «Я ганаруся тым, што мой народ — вы — з'яўляецца апорай гэтых каштоўнасцяў. Цяпер нам аддаюць даніну павагі, што мы засталіся тымі людзьмі, якія павінны жыць на гэтай зямлі і паказваць прыклад іншым, як трэба будаваць адносіны», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. «Прыйдзе час, і мы будзем багатыя матэрыяльна, таму што мы багатыя духоўна», — упэўнены беларускі лідар.

■ Фінансы

ДАЎГІ ВЫПЛАЦІЛІ...

Але золатавалютныя рэзервы краіны па выніках мая, згодна з метадалогіяй МВФ, скараціліся на 84,5 млн долараў ЗША і, па папярэдніх звестках, на 1 чэрвеня склалі 5,3956 млрд долараў ЗША ў эквіваленце, паведамляе ўпраўленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў Нацбанка.

У нацыянальным вызначэнні аб'ём золатавалютных рэзерваў скараціўся на 3,1 млн долараў і на 1 чэрвеня склаў 6,0912 млрд у эквіваленце. «На зніжэнне рэзерваў у маі 2014 года паўплывала пагашэнне ўрадам і Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь у поўным аб'ёме знешніх і ўнутраных абавязацельстваў у замежнай валюце, а таксама зніжэнне кошту золата на міжнародным рынку каштоўных металаў», — тлумачаць у Нацбанку.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.

■ АПК: праблемы і рашэнні

ЛЮБІ ЗЯМЛЮ — ЯНА НЕ ПАДВЯДЗЕ

Знаёмы старшыня сельскагаспадарчай арганізацыі сказаў неяк (ці то жартам, ці то ўсур'ёз), што зямлю трэба любіць, як жонку. Толькі тады атрымаеш добры вынік. І гэты кіраўнік, калі задумацца, мае рацыю.

Айчынныя навукоўцы сцвярджаюць, што калі б на сяле не парушалі тэхналогіі, а працаўнікі былі дысцыплінаванымі, ураджайнасць радавала б, як і іншыя вынікі працы. Гэта ж тычыцца і «малочнікаў» таксама: даглядай карову на ферме, як асабістую, і надоі будуць добрыя, а з імі і заробак.

Чаму пры аднолькавых кліматычных і іншых умовах, напрыклад, Пастаўскі раён па многіх паказчыках — аўтсайдар, а Глыбоцкі — у перадавіках?

Алег МОРХАТ, старшыня Глыбоцкага райвыканкама, па спецыяльнасці аграном. Працаваў раней на розных пасадах у Шаркаўшчынскім, Браслаўскім, Чашніцкім раёнах. У ліку іншага кіраваў сельскагаспадарчай арганізацыяй.

— Для паспяховай працы самай галоўнай умовай павінна быць дысцыпліна. Вытворчым працэсам трэба правільна кіраваць, а працу рацыянальна арганізоўваць, — лічыць ён.

Дарэчы, Глыбоцкі — асаблівы рэгіён. І некаторыя зайздросяць таму, што там усё ёсць: акрамя прыкладна 15 сельскагаспадарчых і абслуговых арганізацый, двух комплексаў буйной рагатай жывёлы, свінакомплексу — практычна ўся «перапрацоўка». Гэта кансервавае і малочнакансервавае прадпрыемствы, мясакамбінат, камбікормавы і два льнозаводы. Глыбоцкія каўбасы, згушчанае малако, розныя кансервы карыстаюцца вялікім попытам не толькі на Віцебшчыне.

Ёсць у Прыдзвінскім краі і асобна ўзятыя гаспадаркі, на прыкладзе якіх працаваць можна павучыцца нават некаторым аграрыям Еўрасаюза. У гаспадарцы «Альгоўскае» Віцебскага раёна былі ўраджаі збожжавых і пад 70 цэнтнераў з гектара. Камбайнеры і іншыя прадстаўнікі — пастаянныя ўдзельнікі рэспубліканскага свята вёскі «Дажынкі». Акрамя традыцыйных для нашай краіны культур, тут эксперыментуюць з вінаградам.

— Сакрэт нашай плённай работы — у добрых традыцыях яшчэ з савецкіх гадоў, калі калектыў калгаса імя Чырвонай Арміі дэманстраваў самы высокі клас працы. Яго былы кіраўнік, Герой Сацыялістычнай Працы Міхаіл Ісакавіч Кац, узначальваў гаспадарку з канца 1950-х да сярэдзіны 1980-х гадоў. Калі Кац стаў старшынёй, было яму толькі 35 гадоў. Шмат чаго карыснага зрабіў для вёскі і развіцця вытворчасці. Ён не кожнага браў на працу. І цяпер земляробаў і іншых спецыялістаў у «Альгоўскім» адбіраюць па конкурсе. Мне ў свой час пашанцавала пазнаёміцца з віцебскім вінаградарам Віктарам Паўлавічам Кухаравым і асабіста ўбачыць яго плантацыю. Я на маёй радзіме, у Грузіі, такога не бачыў: больш як 200 гатункаў ягад! Загараўся і вырашыў вырошчваць вінаград у прамысловых маштабах, — расказвае **Дэміко НАДЗІРАШВІЛІ, кіраўнік сельскагаспадарчага вытворчага кааператыва «Альгоўскае».**

Вінаград з-пад Віцебска аказаўся вельмі смачным і патэнцыйна добрым канкурэнтам для прывазнога. Дарэчы, гаспадарка ў ліку іншага мае і фірмовую сетку крам.

Але пакуль адны стараюцца працаваць эфектыўна, многія, напэўна, спадзяюцца на ўдачу.

— Летась ураджайнасць збожжавых у амаль 140 гаспадарках была больш за 30 цэнтнераў з гектара, а ў 95 — да 20 цэнтнераў. А ў цэлым вобласць штогод стабільна здае дзяржаве больш як 1 мільён збожжавых... Калі казаць пра надоі, то ёсць прадпрыемства, дзе з цяжкасцю надаілі за год ад каровы 1,5 тысячы літраў малака. У 52 гаспадарках надоі да 3 тысяч літраў, у прыкладна столькі ж — да 5 тысяч, — канстатуе **Эдуард ДЗЯМ'ЯНАЎ, намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама.**

Адна з галоўных праблем аграпрамысловага сектара паўночнай вобласці Беларусі тыповая для ўсёй краіны: вялікія пазыкі па крэдытах і касмічныя памеры працэнтнай стаўкі апошніх.

Па падліках спецыялістаў, 38% ад выручкі ідзе на кампенсацыю банкаўскіх крэдытаў. Ва ўрадзе, зразумела, ведаюць пра гэты «галаўны боль».

І як нядаўна адзначыў **віцэ-прэм'ер Міхаіл РУСЫ** падчас сустрэчы з адказнымі асобамі ў Полацку, трэба наогул вырашыць праблему запазычанасці аграпрамысловага комплексу, асабліва крэдыторскай. Выходзячы з гэтага, былі падрыхтаваны чатыры праекты ўказа Прэзідэнта. Будзе прадугледжаны шэраг прэферэнцый, але даўгі прыйдзецца ўсё роўна вяртаць! Кіраўнікі гаспадарак, райвыканкамаў павінны так кіраваць, каб зарабляць больш грошай. У выніку будзе добра ўсім: у цэлым дзяржаве, раёну, гаспадарцы і кожнаму працавітаму вяскоўцу.

Мяркуецца, што ўжо ў наступным годзе дзяржаўны заказ стане вельмі прывабным, па выгадных рыначных цэнах — толькі працуй.

Якасная сельскагаспадарчая прадукцыя заўсёды запатрабавана, а інвестыцыі ў зямлю могуць прыносіць добрыя даходы. Так робіцца ва ўсім цывілізаваным свеце, і Беларусь, вядома, не выключэнне. Няўжо мы менш працавітыя, чым, напрыклад, швейцарцы, галандцы? Ды не. І зямлі, і вады хапае. Любі сваю зямлю — і яна не падвядзе.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

БІЛЕТЫ БУДУЦЬ НЕ НА ЎСЕ ЦЯГНІКІ ВА УКРАІНУ

Беларуская чыгунка часова прыпыніла продаж білетаў на некаторыя цягнікі, што ідуць па тэрыторыі Украіны.

Як распавялі ў прэс-цэнтры Беларускай чыгункі, на падставе паведамлення ўкраінскай чыгуначнай адміністрацыі — у сувязі з частковай карэкціроўкай графіку руху цягнікоў па тэрыторыі Украіны — часова прыпынена рэалізацыя праязных дакументаў на наступныя цягнікі: №46/45 Мінск — Мінеральныя Воды (уключаючы бесперасадачныя вагоны Брэст — Мінеральныя Воды і Магілёў — Мінеральныя Воды) — з 15 чэрвеня; №384/383 Баранавічы — Марыупаль (уключаючы бесперасадачныя вагоны Віцебск — Марыупаль) і №302/301 Мінск — Адлер (уключаючы бесперасадачныя вагоны Брэст — Адлер і Магілёў — Адлер) — з 16 чэрвеня; №390/389 Мінск — Анапа (уключаючы бесперасадачныя вагоны Брэст — Анапа і Магілёў — Анапа) — з 17 чэрвеня.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ЖЫЦЦЁ ЗАБРАЎ ДНЕПР

Яшчэ адно непаўналетняе дзіця стала ахвярай ракі Днепр у Магілёве. У канцы мая тут абарвалася жыццё 7-гадовай дзяўчынкі, а цяпер такі ж трагічны лёс напаткаў 12-гадовага хлопчыка.

Ён патануў падчас купання са сваімі сябрамі ў непрыстасаваным для гэтага месцы па вуліцы Лакамабільнай. Паводле слоў відавочцаў, хлопчык разам з іншымі падлеткамі ныраў з самаробнага прыстасавання і пасля няўдалай спробы стаў клікаць на дапамогу. Але хутка знік пад вадой. Цела падлетка праз паўгадзіны пасля здарэння паднялі з чатырохметровай глыбіні вадалазы Дняпроўскай станцыі абласной службы Таварыства выратавання на водах.

Як паведаміў вадалаз гэтай станцыі Аляксей Камянецкі, сёлетні купальны сезон выдаўся асабліва напружаны. З пачатку школьных канікул матросам ужо неаднаразова даводзілася выцягваць з вады не разлічыўшых свае сілы падлеткаў. Нямала клопатаў выратавальнікам дастаўляюць яшчэ і выпівохі.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

ХТО ЛЕПШЫ ЦЫРУЛЬНІК?

Адкрыты конкурс «Свет прыгажосці» і першынство на Кубак Мінскай вобласці па цырульніцкім майстэрстве, дэкаратыўнай касметыцы і пазногцевым сэрвісе пройдзе 20 чэрвеня ў Маладзечне.

У 16 намінацыях будуць спаборнічаць больш чым 100 прафесіяналаў, якія аказваюць вышэйазначаныя паслугі на прадпрыемствах Міншчыны, незалежна ад формы ўласнасці. Па выніках першынства будзе вызначаны лепшы майстар сталічнага рэгіёна.

Удзел у конкурсе дазволіць кожнаму не толькі павысіць свой прафесійны імідж, а таксама імідж арганізацыі, але і прадстаўляць Мінскую вобласць на рэспубліканскім і сусветным узроўнях.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

СУКВЕЦЦЕ КУЛЬТУР — СУЛАДДЗЕ ЖЫЦЦЯ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

На ўкраінскім — наладзілі выставу вырабаў народнай творчасці ўкраінцаў Беларусі, а таксама свята варэнікаў — з начынкай на любы густ. Татары і башкіры знаёмілі з рознымі відамі нацыянальнай барацьбы. Дагестанцы падрыхтавалі выставу халоднай зброі, а страў нацыянальнай кухні было столькі, колькі народнасцяў, якія жывуць у Дагестане. Беларуска-палесцінская суполка паказала вясельны абрад, калі сябры на руках нясуць жаніха да нявесты пасля... лазні. На падворку грамадскага аб'яднання «Дом іранцаў» гучалі экзатычныя для нас музычныя інструменты (даф, тунбак, сетар, тар, сантур), правялі майстар-клас па каліграфіі. Малдаване запрашалі гасцей у танцавальнае кола, паказвалі нацыянальныя ручнікі і дываны ручной работы, некаторым з якіх ужо больш за стагоддзе...

Адзін з фестывальных падворкаў сёлета ўпершыню быў паштовым. І гэта даволі сімвалічна, бо менавіта пошта задоўга да з'яўлення тэлефона і інтэрнэту са скайпам была для людзей розных нацыянальнасцяў, якія пераязджалі жыць да нас з іншых куткоў свету, адзіным сродкам сувязі з іх гістарычнай радзімай. На падворку былі прадстаўлены элементы гродзенскай пошты даўніх часоў (адзенне паштовых служачых, штэмпелі, маркі, канверты...), а таксама знаёмілі з сучаснымі паслугамі.

У заключны дзень фестывалю ў сёлетняй культурнай сталіцы Беларусі «ўладарыў» тэатр. 8 спектакляў былі ў праграме свята нацыянальнага тэатральнага мастацтва, прычым у самых розных жанрах. Напрыклад, артысты эксперыментальнага тэатра-студыі «Бачонак» паказалі прэм'еру грузінскай музыкальнай камедыі «Вай мэ, Ханума!». Яўрэйскі тэатр «Шалом» — музычны спектакль «Падарунак лёсу». А выпускны клас тэатральнага аддзялення Гродзенскай школы мастацтваў імя Тызенгаўза — пастаноўку знакамітага «Рэвізора». На вуліцах горада людзей забаўлялі тэатры пантамімы, роставых лялек, моды, касцюма і прычоскі...

...Пэўна, такой колькасці мясцовых жыхароў і гасцей, столькі пазітыўных эмоцый, усмешак у фестывальным Гродне дагэтуль яшчэ не было. У чарговы раз свята пацвердзіла, што наша краіна — гэта беларускі дом, дзе шануюць людзей любой нацыянальнасці. Дзе ўсе мы розныя, але мы — разам!

Барыс ПРАКОПЧЫК, фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

■ Будзь у курсе

«ІНДЭЗІТЫ» ВЯРТАЮЦЦА Ў ГАНДЛЁВУЮ СЕТКУ

Дзяржстандарт выдаў прадпісанне аб выманні з гандлёвай сеткі імпартных халадзільнікаў «Індэзіт». Гэта стала вынікам праверкі, якую правяла інспекцыя Дзяржстандарта па Мінскай вобласці і г. Мінску ў філіяле ТАА «Тытунь Інвест» «Гандлёвы цэнтр «Карона» ў сталіцы.

Чатыры найменні халадзільнікаў гандлёвай маркі «Індэзіт» — BIA 18NF, BIA 20, BIA 20X, IB 201S — вытворчасці Расійскай Федэрацыі (г.Ліпецк, ЗАТ «Індэзіт Інтэрнэшнл») рэалізоўваліся ў згаданай гандлёвай арганізацыі з парушэннямі патрабаванняў бяспекі, устаноўленых у дзяржаўным стандарце на гэтую прадукцыю. Па выніках выпрабаванняў, якія праводзіліся падчас праверкі спецыялістамі акрэдытаванай выпрабавальнай лабараторыі, быў выяўлены шэраг неадпаведнасцяў яму.

Так, устройства мацавання сеткавага шнура не было зафіксавана належным чынам: пры выпрабаваннях яго пашкоджанне адбылося ўжо пасля 3-кратнага прыкладання цягнучага намагання замест 25-кратнага, устаноўленага стандартам. Мантаж і мацаванне сеткавага шнура не забяспечвалі надзейнасць зазямлення халадзільніка. Тым самым не была выключана магчымасць паражэння электрычным токам пры выкарыстанні прыбора. Акрамя таго, заправачныя трубкі матор-кампрэсараў мелі вострыя кромкі, якія стварающь небяспеку для спажыўца пры эксплуатацыі і абслугоўванні вырабаў. Тым не менш на вышэйназваныя халадзільнікі ёсць сертыфікаты адпаведнасці Мытнага саюза, выдадзеныя ў Расійскай Федэрацыі, паведамляе прэс-служба Дзяржстандарта.

Гандлёвае прадпрыемства атрымала прадпісанне арганізаваць вяртанне спажыўцамі і выманне з абарачэння праверанай прадукцыі. Матэрыялы аб выяўленых адміністрацыйных правапарушэннях і выкарыстанні штрафных санкцый перададзены ў судовыя органы. Апроч гэтага, афіцыйная інфармацыя аб выніках праверкі будзе накіравана ў Федэральную службу па акрэдытацыі «Расакрэдытацыя» для ацэнкі дзейнасці органа па сертыфікацыі, які выдаў сертыфікат адпаведнасці.

БЕЛАЕ ПАВІННА БЫЦЬ ЧЫСТЫМ

Гарадоцкі раённы выканаўчы камітэт забараніў выкарыстанне маламерных суднаў з бензінавымі падвяснымі лодачнымі маторамі, катараў і гідрацыклаў на шэрагу водных аб'ектаў.

Паводле інфармацыі Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, гэта азёры Лугавое, Шчарбакоўскае, Арэхавае, размешчаныя з заходняга боку Гарадка; возера Цёста з паўночна-ўсходняга боку вёскі Сяло Стадалішчанскага сельсавета; возера Рамашкава з заходняга боку і возера Азяркі з паўночнага боку вёскі Азяркі Межанскага сельсавета; возера Белае, размешчанае з паўночнага боку вёскі Сурміна Гуркінскага сельсавета; возера Чарнаво з паўднёвага боку вёскі Клюшова Віраўлянскага сельсавета.

Такое рашэнне было прынята на падставе артыкула 23 Воднага кодэкса Рэспублікі Беларусь у мэтах аховы жыцця і здароўя грамадзян, забеспячэння насельніцтва вадой для пітных і гаспадарчых патрэб, захавання рэжыму карыстання асабліва ахоўных тэрыторый.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Калектыў Інстытута журналістыкі БДУ выказвае шчырыя спачуванні сакратару прыёмнай Ваўчковай Алесі Мікалаеўне з прычыны напаткаўшага яе гора — смерці БАЦЬКІ.

КРАТКАЯ ИНФОРМАЦИЯ

об открытой продаже жилищных облигаций
сорок пятого, сорок шестого, сорок седьмого, сорок восьмого выпусков
Коммерческой совместной организации «Внешэкономстрой» общества с ограниченной ответственностью (КСО «Внешэкономстрой» ООО)

Раздел 1. Общие сведения об эмитенте

1. Наименование эмитента.
На белорусском языке:
полное наименование: Камерцыйная сумесная арганізацыя «Знешэканомбуд» таварыства з абмежаванай адказнасцю;
сокращенное наименование: КСА «Знешэканомбуд» ТАА.
На русском языке:
полное наименование: Коммерческая совместная организация «Внешэкономстрой» общество с ограниченной ответственностью (далее по тексту – эмитент);
сокращенное наименование: КСО «Внешэкономстрой» ООО.

2. Место нахождения эмитента: 220004, Республика Беларусь, г. Минск, пр. Победителей, д. 27, пом. 362; телефон: (017) 393-07-96; факс: (017) 393-07-96; электронный адрес (e-mail): info@bves.by.

3. Основной вид деятельности эмитента:
согласно Общегосударственному классификатору Республики Беларусь «Виды экономической деятельности» ОКРБ 005-2006
701 – Операции с собственным недвижимым имуществом.
КСО «Внешэкономстрой» ООО заключен договор на реализацию права проектирования и строительства объекта «Многоквартирный жилой дом по генплану № 12 в жилом районе Лебяжий» от 08.01.2013 № 01-Д с Минским городским исполнительным комитетом.

4. Номер расчетного счета эмитента, на который будут зачисляться средства, поступающие при проведении открытой продажи, наименование обслуживающего банка: р/с № 3012004529008 в ОАО «Банк БелВЭБ», код 226; 220004 г. Минск, пр. Победителей, 29.

5. Наименования периодических печатных изданий для раскрытия информации:
Эмитентом для раскрытия информации определено следующее печатное издание: газета «Звязда».
Срок публикации информации о внесенных изменениях в Проспект эмиссии – не позднее семи календарных дней после регистрации соответствующих изменений в Департаменте по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь.
Срок публикации информации о возбуждении в отношении эмитента производства по делу об экономической несостоятельности (банкротстве) – в течение пяти рабочих дней с момента получения соответствующего судебного постановления.
Срок публикации информации о принятом решении о реорганизации эмитента – не позднее пяти рабочих дней после принятия соответствующего решения уполномоченным органом эмитента.
Информация о принятом решении о ликвидации (прекращении деятельности) эмитента публикуется в приложении к журналу «Юстиция Беларуси» в срок не позднее пяти рабочих дней после принятия соответствующего решения уполномоченным органом эмитента.

Бухгалтерская отчетность эмитента в составе, определенном пунктом 8 Инструкции о порядке представления и публикации участниками рынка ценных бумаг отчетности и иной информации, утвержденной постановлением Министерства финансов Республики Беларусь от 21.12.2010 г. № 157 «О некоторых вопросах представления и публикации участниками рынка ценных бумаг отчетности и иной информации», в соответствии с законодательством в периодическом печатном издании не публиковалась и ее опубликование не требуется.

6. Наименование депозитария, обслуживающего эмитента: (далее по тексту – депозитарий).
ОАО «Банк БелВЭБ» (далее по тексту – депозитарий).
Юридический адрес: Республика Беларусь, 220004, г. Минск, пр-т Победителей, 29.
Место нахождения и почтовый адрес депозитария: Республика Беларусь, 220030, г. Минск, ул. Мясникова, 32, ком. 607.
Дата и место государственной регистрации депозитария — зарегистрирован Национальным Банком Республики Беларусь 12 декабря 1991 года, регистрационный номер 24.
Специальное разрешение (лицензия) № 02200/5200-124-918 выдано Министерством финансов Республики Беларусь 29 июля 2002 г. Срок действия специального разрешения (лицензии) продлен на основании решения № 243 от 13 июля 2007 г. и решения № 155 от 24 мая 2012 г. Срок действия лицензии до 29 июля 2022 г.
УНП 100010078.

7. Размер уставного фонда эмитента: 1 197 275 (Один миллион сто девяносто семь тысяч двести семьдесят пять) долларов США (уставный фонд сформирован в размере 100%).

8. Дата и номер государственной регистрации эмитента, наименование органа, его зарегистрировавшего.
Коммерческая совместная организация «Внешэкономстрой» общество с ограниченной ответственностью зарегистрировано Министерством иностранных дел Республики Беларусь 15 августа 2002 года в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 800015707.

9. Место, время и способ ознакомления с проспектом эмиссии.
Ознакомиться с Проспектом эмиссии облигаций можно ежедневно (кроме выходных и нерабочих праздничных дней) с 9:00 до 12:30 и с 14:00 до 15:00 (в пятницу, а также в дни, предшествующие выходным и праздничным дням, объявленным нерабочими, с 9:00 до 12:30) начиная с даты публикации в средствах массовой информации текста краткой информации об открытой продаже облигаций:
- в КСО «Внешэкономстрой» ООО по адресу: 220004, г. Минск, пр. Победителей, д. 27, пом. 362;
- в ОАО «Банк БелВЭБ» по адресу: 220030, г. Минск, ул. Мясникова, 32, каб. 607.

10. Решение о выпуске жилищных облигаций сорок пятого, сорок шестого, сорок седьмого, сорок восьмого выпусков принято «08» мая 2014 года на внеочередном Общем собрании Участников **(протокол № 27).**

11. Объем эмиссии жилищных облигаций составляет:
сорок пятого выпуска – 28 050 000 000 (Двадцать восемь миллиардов пятьдесят миллионов) белорусских рублей;
сорок шестого выпуска – 34 000 000 000 (Тридцать четыре миллиарда) белорусских рублей;
сорок седьмого выпуска – 16 200 000 000 (Шестнадцать миллиардов двести миллионов) белорусских рублей;
сорок восьмого выпуска – 11 875 000 000 (Одиннадцать миллиардов восемьсот семьдесят пять миллионов) белорусских рублей.
Количество жилищных облигаций:
сорок пятого выпуска – 1 700 (Одна тысяча семьсот) штук;
сорок шестого выпуска – 2 000 (Две тысячи) штук;
сорок седьмого выпуска – 900 (Девятьсот) штук;
сорок восьмого выпуска – 950 (Девятьсот пятьдесят) штук;

12. Номинальная стоимость одной жилищной облигации:
сорок пятого выпуска составляет 16 500 000 (Шестнадцать миллионов пятьсот тысяч) белорусских рублей и имеет эквивалент, равный одному квадратному метру общей площади жилого помещения (квартира в «Многоквартирном жилом доме по генплану № 12 в жилом районе Лебяжий»);
сорок шестого выпуска составляет 17 000 000 (Семнадцать миллионов) белорусских рублей и имеет эквивалент, равный одному квадратному метру общей площади жилого помещения (квартира в «Многоквартирном жилом доме по генплану № 12 в жилом районе Лебяжий»);
сорок седьмого выпуска составляет 18 000 000 (Восемнадцать миллионов) белорусских рублей и имеет эквивалент, равный одному квадратному метру общей площади жилого помещения (квартира в «Многоквартирном жилом доме по генплану №12 в жилом районе Лебяжий»);
сорок восьмого выпуска составляет 12 500 000 (Двенадцать миллионов пятьсот тысяч) белорусских рублей и имеет эквивалент, равный одному квадратному метру общей площади жилого помещения (квартира в «Многоквартирном жилом доме по генплану № 12 в жилом районе Лебяжий»);

13. Открытая продажа (размещение) жилищных облигаций проводится с «11» июня 2014 года и по «30» июня 2015 года.

14. Срок обращения облигаций с «11» июня 2014 года по «31» августа 2015 года включительно (446 календарных дней).

15. Проведение открытой продажи (размещения) жилищных облигаций осуществляет:
- ОАО «Банк БелВЭБ» ежедневно (кроме субботы и воскресенья, а также за исключением государственных праздников и праздничных дней, установленных и объявленных нерабочими в соответствии с законодательством Республики Беларусь) с 9:00 до 16:00 (в пятницу, а также в дни, предшествующие выходным и праздничным дням, объявленным нерабочими – с 9:00 до 15:00) по адресу: 220030, г. Минск, ул. Мясникова, 32, каб. 607;
- КСО «Внешэкономстрой» ООО ежедневно (кроме субботы и воскресенья, а также за исключением государственных праздников и праздничных дней, установленных и объявленных нерабочими в соответствии с законодательством Республики Беларусь) с 9:00 до 16:00 (в пятницу, а также в дни, предшествующие выходным и праздничным дням, объявленным нерабочими – с 9:00 до 15:00) по адресу: 220004, г. Минск, пр. Победителей, 27, офис. 362.

16. Жилищные облигации сорок пятого, сорок шестого, сорок седьмого и сорок восьмого выпусков обеспечиваются банковской гарантией ОАО «Банк БелВЭБ» в сумме 90 125 000 000 (Девяносто миллиардов сто двадцать пять миллионов) белорусских рублей. Срок действия банковской гарантии – не позднее 30.11.2015 г.

17. Облигации зарегистрированы Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь 05. 06. 2014 года.
Регистрационный номер облигаций сорок пятого: W5-200-02-2172.
Регистрационный номер облигаций сорок шестого: W5-200-02-2173.
Регистрационный номер облигаций сорок седьмого: W5-200-02-2174.
Регистрационный номер облигаций сорок восьмого: W5-200-02-2175.

УНП 800015707

Мы разам — Беларусь!

Краіна моцная рэгіёнамі: Ашмянскі раён



РЭГІЁН, ПРЫЦЯГАЛЬНЫ ДЛЯ БІЗНЕСУ

Лепшы горад для бізнесу — такі статус Ашмяны атрымалі ў 2011 годзе. З таго часу прайшло ўжо тры гады, але рэгіён па-ранейшаму з'яўляецца прыцягальным як для мясцовых, так і для замежных інвестараў. Пра сюрпрызы, якія чакаюць жыхароў раёна і турыстаў, распавёў «Звяздзе» старшыня Ашмянскага райвыканкама Міраслаў САРАСЕК.

— Міраслаў Эдмундавіч, Ашмянскі раён знаходзіцца ў выгадным геаграфічным становішчы, на мяжы з Літвой. Наколькі суседства спрыяе дзелавым адносінам паміж дзвюма краінамі?

— Безумоўна, наша размяшчэнне спрыяе актыўнаму супрацоўніцтву, прычым не толькі ў эканамічнай, але і ў сацыяльнай, культурнай сферах. Маем партнёраў, з якімі падтрымліваем добрыя, цесныя стасункі, не толькі ў Літве, але і ў Польшчы. Актыўна ўдзельнічаем у праграмах трансгранічнага супрацоўніцтва «Польшча — Беларусь — Украіна» і «Латвія — Літва — Беларусь». Так, сёлета мы падрыхтавалі для жыхароў горада прыемны сюрпрыз — веласцяжынку працягласцю амаль два кіламетры. Пабудавалі яе практычна цалкам за сродкі Еўрасаюза. Сцяжынка месціцца ў лесапаркавай зоне, праходзіць уздоўж аднаго з самых маляўнічых месцаў нашага горада — ракі Ашмянка. У бліжэйшы час плануем злучыць веласцяжынку з новым фізкультурна-аздараўленчым комплексам, арганізаваць там пракат веласіпедаў.

— Вы згадалі пра новы фізкультурна-аздараўленчы комплекс. Наколькі я ведаю, ён адкрыўся летась, перад «Дажынкамі», як і футбольны стадыён ды дзіцячы садок. Наколькі запатрабаваны гэтыя аб'екты?

— Сёння ні стадыён, ні фізкультурна-аздараўленчы комплекс практычна не пустуюць. У горадзе ёсць дзіцяча-юнацкая спартыўная школа, прыватная футбольная школа, аматарскі футбольны клуб. Акрамя таго, да нас на трэніроўкі прыязджаюць спартсмены з суседніх раёнаў. Больш за тое, сёлета да канца года ў межах праекта Еўрасаюза, які мы рэалізуем разам з польскім рэгіёнам Сувалкі, пабудуем яшчэ адзін стадыён на 500 глядацкіх месцаў коштам прыкладна 800 тысяч еўра — побач з аграрна-тэхнічным каледжам. Пра запатрабаванасць новага дзіцячага сада, думаю, казаць няма патрэбы. Ён стаў сапраўдным выратаваннем для горада.

— Значыць, з дэмаграфіяй у раёне ўсё ў парадку?

— Так, з кожным годам у нас заключаецца ўсё больш шлюбаў, нараджаецца больш дзяцей. Сёння на 1000 насельніцтва нараджальнасць у Ашмянскім раёне адна з самых высокіх. Добрай навіной для будучых матуль, думаю, будзе тое, што да канца года новы выгляд атрымае радзільнае аддзяленне раённай бальніцы. Мы ўжо там практычна завяршылі рамонт, цяпер набываецца сучаснае абсталяванне. Абноўленае аддзяленне будзе адным з самых лепшых у вобласці.

— Пэўна, рост нараджальнасці абвастрае жыллёвую праблему?

— Я не сказаў бы, што жыллёвае пытанне стаіць вельмі востра. Актыўна будуецца жыллё, цэлыя мікрараёны. У прыватнасці, летась тры шматкватэрныя дамы пабудавалі. Сёлета, як мінімум, яшчэ столькі ж плануем здаць. Шмат будуецца індывідуальнага жылля і ў Ашмянах, і ў аграгарадках-спадарожніках, якія ўжо мала чым па інфраструктуры саступаюць гораду. Радуе, што многія хочуць тут жыць і працаваць. Для маладых спецыялістаў і сем'яў, якія прыязджаюць і не маюць магчымасці адразу палепшыць свае жыллёвыя ўмовы, на наступны год плануем пабудаваць 30-кватэрны арэндны дом.

— У якіх аб'ектах сёння раён мае патрэбу? Над чым яшчэ неабходна працаваць?

— Дом культуры будзем старацца прывесці ў парадак. Калі сустракаўся з гараджанамі, прагучала просьба пабудаваць басейн. Спадзяёмся, што хутка ён з'явіцца ў Ашмянах, праект ужо ёсць — гэта другая чарга будаўніцтва фізкультурна-аздараўленчага комплексу. Для жыхароў Гальшан і прылеглых вёсак плануем пабудаваць сучасную амбулаторыю з дзённым стацыянарам. Вось тры асноўныя прыярытэты на бліжэйшы час. Вядома, патрэбен і маладзёжны цэнтр, і новая гасцініца, не перашкодзіў бы яшчэ адзін дзіцячы садок у новым мікрараёне... Але гэта ўжо задачы на перспектыву.

— Перад краінай стаіць задача па прыцягненні інвестыцый. Раскажыце пра інвестыцыйныя праекты, якія ажыццяўляюцца ў раёне.

— Мы знаходзімся ў транспартным калідоры, таму ахвотных будаваць тут свае аб'екты хапае. Прычым мы сёння маем шэраг перспектыўных інвестпраектаў менавіта ў сферы прыдарожнага сэрвісу. На аўтадарозе Мінск — Ашмяны — мяжа Літвы неўзабаве з'явіцца аб'екты прыдарожнага сэрвісу літоўскіх кампаній. На развязцы каля дарогі ў кірунку атамнай электрастанцыі плануюць узвесці станцыю тэхабслугоўвання, гасцініцу, кавярню мясцовыя інвестары. Радуе, што нашы ашмянскія прадпрымальнікі не стаяць на месцы, імкнуцца развівацца, пашырацца. Паралельна з вытворчасцю шклопакетаў вырашылі ўкладаць грошы ў прыдарожны бізнес. Там жа, побач з аб'ектам прыдарожнага сэрвісу першай катэгорыі, будзе заправачная станцыя, якую будуе «Беларусьнафта». Дастаткова сур'ёзны інвестыцыйны праект задумалі рэалізаваць з «Белмытнасэрвісам». Плануем пабудаваць транспартна-лагістычны цэнтр з гасцініцай, паркоўкай, кавярняй у раёне пункта памежнага кантролю і мытнага афармлення «Каменны Лог». Спадзяёмся запусціць усе гэтыя праекты на працягу гэтага-наступнага года. Гэта важна яшчэ і таму, што колькасць тых, хто перасякае мяжу праз гэты пункт пропуску, павялічваецца.

— А што тычыцца вытворчасці?

— Адкрываюцца новыя прадпрыемствы, у тым ліку і з замежным капіталам. Нядаўна мы пачалі працаваць з кампаніяй «Унісон груп» з армянскім капіталам, якая выпускае кандытарскія вырабы і вельмі хуткімі тэмпамі заваёўвае свайго пакупніка. Плануем пабудаваць завод па вытворчасці дражджавога экстракту. Ужо ўчастак адведзены, вядзецца праектаванне. Асноўны інвестар — аўстрыйская кампанія. Новае сучаснае прадпрыемства будзе працаваць на беларускай сыравіне, якой у нас дастаткова. У выніку мы атрымаем прадукцыю, якая будзе не толькі закрываць нашы ўнутраныя патрэбы, але і ісці на экспарт у Расію, краіны Еўрасаюза. Акрамя таго, новая вытворчасць дазволіць стварыць да 100 працоўных месцаў.

— Не раз даводзілася чуць, што ў Ашмянскім раёне вельмі спрыяльныя ўмовы для бізнесу. Як садзейнічаеце развіццю прадпрымальніцтва?

— Прадпрымальніцтва займае трывалае месца ў структуры эканомікі Ашмянскага раёна. На пачатак года ў нас зарэгістравана 210 малых прадпрыемстваў і 544 індывідуальныя прадпрымальнікі. Сакрэт просты: кожную канструктыўную дзелавую прапанову імкнёмся пачуць і падтрымаць. Даём людзям магчымасць праявіць сваю прадпрымальнасць у розных сферах: ад вытворчай дзейнасці да развіцця турыстычнай інфраструктуры. Праводзім рэгулярна аўкцыёны, дзе прадаём пустуючыя аб'екты ды зямельныя ўчасткі пад развіццё бізнесу. Каб весці плённы дыялог з прадпрымальнікамі, на базе Ашмянскага дзяржаўнага аграрна-эканамічнага каледжа стварылі Цэнтр падтрымкі прадпрымальніцтва, пры райвыканкаме — Савет па развіцці прадпрымальніцтва. У нас рэгулярна праходзяць сходы. Як правіла, я таксама прымаю ў іх удзел. Усё, што тычыцца ўзгадненняў, дазволаў, стараемся для нашых бізнесменаў рабіць аператыўна.

— Напэўна, і турысты, якія на Ашмяншчыне частыя госці, у вялікай ступені спрыяюць прадпрымальніцкай актыўнасці?

— Турызм і інвестыцыі — узаемазвязаныя рэчы. У якасці прыкладу можна прывесці Гальшаны. Там у сферы паслуг, гандлю вельмі актыўна прадстаўлены прыватны бізнес. Прадпрымальныя людзі набываюць незадзейнічаныя аб'екты і арганізуюць там бары, кавярні, гасцініцы. Іх, вядома, як вы заўважылі, актывізуе вялікая колькасць турыстаў, якія прыязджаюць паглядзець на адны з самых маляўнічых руін. Гальшанскі замак, дарэчы, знаходзіцца ў праграме «Замкі Беларусі». Некалькі гадоў таму мы там устанавілі памятны знак у гонар Соф'і Гальшанскай, ад дзяцей якой пачаліся самыя вядомыя дынастыі ўладароў Еўропы. Ужо традыцыйным стаў фестываль сярэднявечнай культуры «Гальшанскі замак». Стараемся з Міністэрствам культуры захаваць тое, што ёсць, зрабіць так, каб больш замак не разбураўся. Пры раскопках вельмі шмат знаходзіцца розных артэфактаў, таму плануем у бліжэйшы час аднавіць адну з вежаў замка і зрабіць там экспазіцыю. На прылеглай тэрыторыі выкапаць сажалкі, аднавіць парк... Праз некалькі гадоў там будзе зусім іншае месца, яшчэ больш прывабнае для турыстаў.

Надзея ДРЫЛА.

З ПАВАГАЙ ДА ГІСТОРЫІ І ДЫСЦЫПЛІНЫ

Кальчунская сярэдняя школа адметная на Ашмяншчыне. Ужо дзесяць гадоў тут працуе гісторыка-краязнаўчы музей, створаны ў гонар прафесара хіміі і медыцыны Віленскага ўніверсітэта Енджэя Снядэцкага. Цэнтральным экспанатам музея з'яўляецца бюст знакамітага вучонага, зроблены беларускім скульптарам Генадзем Лойкам.

ПРАФЕСАР І ЯГО АДКРЫЦЦЁ

— Дзвесце гадоў таму на лекцыі прафесара Снядэцкага патрапіць было даволі складана, — расказваюць вучні-экскурсаводы. — Справа ў тым, што паслухаць вучонага, які ведаў свой прадмет дасканала, і паназіраць за займальнымі эксперыментамі прыходзілі не толькі студэнты, але і многія жыхары Вільні. Пяру прафесара Снядэцкага належыць і падручнік «Асновы хіміі», у якім тэрміналогія гэтай навукі ўпершыню загучала не па-лацінску, а па-польску. Стаяў вучоны і ля вытокаў стварэння «Дзённіка віленскага», у якім публікаваліся іншыя фундаментальныя працы, што пасля неаднаразова перавыдаваліся і перакладаліся на рускую, нямецкую ды французскую мовы («Тэорыя арганічных субстанцый», «Аб фізічным выхаванні дзяцей»).

Прааналізаваўшы ў 1807 годзе ўзоры плаціны, прафесар Снядэцкі знайшоў у іх невядомы раней метал, якому даў назву «вестый». Годам пазней ён паведаміў пра гэты факт у Санкт-Пецярбургскую акадэмію навук, а таксама прачытаў з гэтай нагоды публічную лекцыю ў Віленскім універсітэце. Але французскі Інстытут навукі заявіў, што адкрыццё прафесара Снядэцкага памылковае. І праца была, па сутнасці, пакладзена ў стол. І толькі праз многія дзесяцігоддзі выявілася, што апісаныя Снядэцкім уласцівасці загадкавага вестыю такія ж, як і ў адкрытага праз 37 гадоў прафесарам Казанскага ўніверсітэта Карлам Клаусам рутэнію.

Старэйшы брат Енджэя, Ян, пэўны час быў рэктарам Віленскага ўніверсітэта. І цяпер у гонар вучоных у Віленскім універсітэце створана аднайменная зала.

Енджэй Снядэцкі пакінуў пасля сябе знакамітых нашчадкаў. Адзін з заснавальнікаў рускай псіхіятрыі, прафесар Пецярбургскай медыка-хірургічнай акадэміі Ян Балінскі — унук прафесара Снядэцкага. А малодшая дачка Енджэя, Людвіка, стварыла разам са сваім мужам Міхалам Чайкоўскім польскае паселішча паблізу... Стамбула.

У школьным музеі. Вучні Інга ГІЗ, Аліна МАСАЛЬСКАЯ, Аляксей ПАБЯДЗІНСКІ выдатна ведаюць гісторыю сваёй малой радзімы. Яны ўмела праводзяць экскурсіі, расказваючы пра славутых землякоў і падзеі мінулага.

А гісторыя гэтая пачыналася так. Пасля паражэння паўстання ў 1831 годзе ў Францыю ўцёк адзін з яго лідараў, князь Адам Чартарыйскі. Разам з ім у далёкую дарогу выправіўся і шляхціц Міхал Чайкоўскі разам з жонкай. Па даручэнні князя Чартарыйскага ён праз некаторы час адправіўся ў Канстанцінопаль, каб заручыцца падтрымкай Асманскай імперыі. Шляхціцу Чайкоўскаму ўдалося ўвайсці ў давер да фаварыта султана Рыза-пашы. І ў 1848 годзе ён атрымаў дазвол на стварэнне на берагу Басфорскага праліва двух польскіх паселішчаў. Адно з іх стала называцца Адампаль. Пазней тамтэйшыя ўлады перайменавалі яго ў Паланэзкёй.

Шануюць памяць легендарных вучоных на Ашмяншчыне не толькі ў школьным музеі. У вёсцы Гальшаны ёсць вуліца, названая ў гонар прафесара. Снядэцкія валодалі Болтупскім маёнткам, які захаваўся да нашых часоў. У вёсцы Гародніскі прафесар Енджэй Снядэцкі разам са сваёй жонкай Канстанцыяй знайшоў апошні прытулак. Мармуровы помнік на яго магіле быў устаноўлены яшчэ ў 1838 годзе. Але яго не кранулі ні рэвалюцыі, ні паўстанне Каліноўскага, ні тры вайны...

Яны вучацца ў дзясятым прававым класе.

ЯК ПРАЦУЕ ПРАВАВЫ КЛАС?

Аднак вядомая Кальчунская сярэдняя школа не толькі музеем у памяць знакамітага прафесара. У ёй быў створаны першы ў раёне прававы клас.

— З'явіўся ён у нас летась, — гаворыць **дырэктар Кальчунскай сярэдняй школы Антон ШМУКСТА.** — Яго наведваюць 11 вучняў-дзесяцікласнікаў. У параўнанні са звычайнымі класамі вельмі адрозніваецца выхаваўчы працэс: мы цесна супрацоўнічаем з мясцовымі органамі ўнутраных спраў. З іх боку нашу дзейнасць курыруе намеснік начальніка Ашмянскага РАУС Іван Куняўскі.

У школу рэгулярна прыязджаюць прадстаўнікі Следчага камітэта і пракуратуры, якія выступаюць перад вучнямі прававога класа са спецыяльнымі лекцыямі ды гутаркамі. Школьнікі ж удзельнічаюць у святочных мерапрыемствах, прысвечаных Дню міліцыі, віншуюць ветэранаў унутраных спраў. Вядома, паколькі клас існуе толькі год, казаць аб грунтоўных выніках працы пакуль ранавата. Аднак калі ўвосень толькі два вучні хацелі пасля заканчэння школы паступаць у вышэйшыя сілавыя навучальныя ўстановы, то цяпер іх ужо пяць. Адметна, што сярод гэтых будучых абітурыентаў ёсць і дзве дзяўчынкі, якіх не палохае вялікі конкурс у Акадэміі МУС.

— Навучальны працэс адрозніваецца не вельмі, — расказвае **класны кіраўнік Аляксандр НАВУМЧЫК.** — Розніцу на першы погляд можна заўважыць хіба што па паглыбленым вывучэнні гісторыі ды грамадазнаўства. Ёсць у класе і факультатыў «Асновы права», назва якога гаворыць сама за сябе. Вучні наведваюць заняткі толькі ў форме. Гэта іх вельмі дысцыплінуе. Імпануе ім і тое, што малодшыя школьнікі ставяцца да іх з павагай.

Трапіць у прававы клас даволі проста. Ніякіх дадатковых экзаменаў здаваць не трэба. Патрэбна толькі пісьмовая згода бацькоў ды заява самога вучня. Адбор ідзе як па паводзінах за ўвесь час навучання ў школе, так і па сярэднім бале: будучы вучань прававога класа не можа мець адзнак, ніжэйшых за шасцёркі. Сэнсу прымаць лайдакоў няма...

ТЭРЫТОРЫЯ, ДЗЕ ПАНУЕ СПОРТ

Заняткі спортам — гэта цудоўны спосаб не толькі правесці вольны час, але і магчымасць умацаваць здароўе. Але для паўнавартасных заняткаў патрэбна такое ж абсталяванне. У Ашмянах папулярызацыі спорту сярод не толькі школьнікаў, але і дарослых людзей надаецца вялікая ўвага. Да паслуг мясцовых жыхароў — фізкультурна-аздараўленчы комплекс і стадыён, пабудаваныя па міжнародных стандартах.

Фізкультурна-аздараўленчы комплекс у Ашмянах узведзены на самым ускрайку горада. Новы велічны будынак вельмі кантрастуе на фоне суседніх пабудоў. А побач з ім раскінуўся прыгожы футбольны стадыён.

— Яшчэ не так даўно на гэтым месцы была пустка, — гаворыць **намеснік старшыні Ашмянскага райвыканкама Аляксандр САВАНЕЦ.** — Дзе-нідзе толькі расло некалькі дрэў — тое, што засталося ад старога фруктовага саду. **Ранейшы наш старшыня Юрый АДАМЧЫК** ставіўся да футбола вельмі прыхільна — быў не толькі балельшчыкам, але і аматарам гэтай гульні. Так вось і нарадзілася ідэя стварыць сапраўдны футбольны стадыён для ўсіх ахвотных. Увогуле, у рэспубліцы такія аб'екты можна пералічыць на пальцах адной рукі.

Сучасны стадыён еўрапейскага ўзроўню немагчыма ўявіць без дрэнажнай сістэмы і штучнага пакрыцця, якое Ашмяны атрымалі ў падарунак ад УЕФА дзякуючы дапамозе Беларускай федэрацыі футбола. Адкрыўся ён не так даўно, летась у кастрычніку. Аднак ужо вельмі палюбіўся жыхарам як Ашмянаў, так і навакольных вёсак.

— Але нам тады паставілі ўмову: мы самі рыхтуем аснову для пакрыцця, — прыгадвае Аляксандр Анатольевіч. — Сабралі мы тады ўсе будаўнічыя і дарожныя арганізацыі і арганізавалі вялікую будоўлю. І толькі пасля таго, як да нас прыехалі спецыялісты з Нідэрландаў і зрабілі ўсе неабходныя замеры, нам прывезлі гэтае пакрыццё, укладкай якога займалася сталічная фірма. Другі дом тут знайшлі сядзенні са стадыёна «Дынама». Іх мы закупілі тады, калі на сталічнай арэне пачаўся капітальны рамонт. Вось толькі металічныя канструкцыі для іх варылі ўжо на месцы. Кварцавы пясок мы прывезлі з радовішча ў Гомельскай вобласці на мяжы з Расіяй. Каб не вылятаў ворс, патрэбна была гумавая крошка. Яе мы закупілі ў Нідэрландах. Разам з пакрыццём нам падарылі міні-трактар і іншае абсталяванне, якое патрэбна для догляду пакрыцця. А каб «дашліфаваць» стадыён да «баявой гатоўнасці», абвясцілі раённы суботнік. Ахвотных дапамагчы было шмат: хто прыйшоў з граблямі, хто з рыдлёўкай, хто з пэндзлем...

У прасторнай зале фізкультурна-аздараўленчага комплексу.

На новым футбольным полі.

Стадыён прыдатны для ўсіх гульнявых відаў спорту на полі. І няма дзён, калі ён пустуе. Пасля абеду па панядзелках, серадах ды пятніцах на ім праводзяцца футбольныя трэніроўкі. Субота — гэта гульнявы дзень для школьнікаў, а на нядзелю яны саступаюць поле дарослым. Кошт такой паслугі дэмакратычны. Для дарослых ён складае 220 тысяч за гадзіну, а для дзяцей — у 10 разоў менш. Калі ўлічыць, што на полі адначасова гуляюць больш за дзесяць чалавек, то сума выходзіць сімвалічная.

Сёння на стадыёне праходзяць раённыя спаборніцтвы па футболе сярод вучняў малодшага школьнага ўзросту. Тут жа дамашнія матчы праводзіць і ФК «Ашмяны», які пакуль выступае ў чэмпіянаце вобласці. Адбываюцца на ім заняткі мясцовай прыватнай футбольнай школы «Нёман».

— А нашы надзеі? Ды вось на каго мы разлічваем, — паказвае на юных гульцоў **дырэктар дзіцяча-юнацкай спартыўнай школы Аляксандр ДЗЕНІСЕНКА.** — Калі яны прыйдуць да нас у першым класе, калі не кінуць па розных прычынах футбол, то ў нас праз некаторы час з'явіцца гульцы-прафесіяналы. Калі ў Ашмяны прыязджаў памочнік Прэзідэнта па пытаннях фізкультуры, спорту і развіцця турызму Максім Рыжанкоў, ён нацэльваў нас менавіта на развіццё дзіцячага спорту.

Сам жа фізкультурна-аздараўленчы комплекс будаваўся два гады. Пагуляць у прасторных спартыўных залах можна ў гандбол, баскетбол, валейбол, міні-футбол, бадмінтон... Што адметна, баскетбольныя шчыты рухомыя. А гэта значыць, што вучыць дзяцей правілам гэтай гульні не толькі ў тэорыі, але і на практыцы можна з самага маленства.

— Бачыце пустку паміж будынкам комплексу і драўлянымі хаткамі? — паказвае Аляксандр Саванец. — Дык вось, тут будзе пабудаваны другі корпус нашага комплексу. У ім размесцяцца басейн і разнастайныя водныя атракцыёны. Вось толькі без інвестыцыйных праграм нам будзе зрабіць гэта цяжкавата... У перспектыве мы разлічваем, што стадыён і фізкультурна-аздараўленчы комплекс стануць папулярнымі яшчэ больш. За 25 кіламетраў ад Ашмян цяпер імкліва развіваецца будучы горад беларускіх атамшчыкаў Астравец, жыць у якім будзе каля 40 тысяч чалавек. І мы чакаем, што яго жыхары будуць прыязджаць да нас, каб займацца спортам. Тым больш што азначае такая адлегласць сёння, у час амаль павальнай аўтамабілізацыі? Паўгадзіны няхуткай язды...

Гэтую сукенку для музея майстры пашылі па эскізе, «скапіраваным» са старога партрэта дачкі Францішка Багушэвіча Канстанцыі.

3D-ПАДАРОЖЖА ПА АШМЯНШЧЫНЕ

Для таго, каб яго здзейсніць, дастаткова завітаць у Ашмянскі краязнаўчы музей імя Ф.К. Багушэвіча

Віртуальны тур «Падарожжа па Ашмянскім узвышшы» дазваляе здзейсніць 3D-вандроўку па Ашмянскім і Віленскім раёнах. Гэта вельмі зручна, бо не заўсёды турысты маюць магчымасць аб'ехаць усе знакавыя месцы Ашмянскага ўзвышша.

— Як правіла, людзі абмежаваны ў часе: наведваюць Гальшаны — і адразу да нас, — распавядае **дырэктар Ашмянскага краязнаўчага музея імя Ф.К. Багушэвіча Настасся НАВІЦКАЯ.** — Абсталяванне, якое мы набылі для турысцка-інфармацыйнага цэнтра (у межах трансгранічнага праекта «Два бакі — адна гісторыя і культура». — **Аўт.**), дазваляе здзейсніць падарожжа па тых мясцінах, па якіх яны не паспелі праехаць. Падчас віртуальнай вандроўкі няма адчування адасобленасці. Можна пабачыць не толькі сам касцёл, але і яго столь, падлогу, сцены... Такое адчуванне, быццам бы ты там знаходзішся!

Музей варта наведаць яшчэ і таму, што там вельмі шмат цікавых экспанатаў. Адзін з іх вы бачыце на фота — гэта сукенка дачкі Францішка Багушэвіча. Але асабіста мяне ўразіла арыгінальнае афармленне экспазіцыйных залаў. У прыватнасці, вітражы: глядзіш на шкло, дзе адлюстравана гарадская плошча пачатку XX стагоддзя, і адначасова праз акно бачыш яе сучасны выгляд. Асаблівай увагі заслугоўваюць дызайнерскія шпалеры з выявай карты ВКЛ, бягучы радок з вершам Францішка Багушэвіча «Мая дудка», якімі аздоблены сцены музея. Дарэчы, аб тым, што музей сапраўды еўрапейскі, сведчыць таксама аўдыягід і подпісы да экспазіцый на дзвюх мовах — беларускай і англійскай.

СУЧАСНЫ ДЗІЦЯЧЫ САДОК: ЯКІМ ЯМУ БЫЦЬ?

З-за спецыфікі дэмаграфічнай сітуацыі некаторыя дзіцячыя садкі ў раённых цэнтрах становяцца малазагружанымі ці проста зачыняюцца з-за непатрэбнасці. Ашмяны — прыемнае выключэнне на гэтым фоне. Летась у новым мікрараёне Заходнім дзверы расчыніў новы яслі-сад № 7.

Разлічаны ён на 10 груп, а гэта — 190 маленькіх жыхароў горада. Хлопчыкаў і дзяўчатак тут сустракаюць шыкоўныя гульнявыя памяшканні, трэнажорны зал з навюткім абсталяваннем, спартыўная, харэаграфічная і музычная зала, а таксама неглыбокі басейн: вучыць дзяцей плаваць трэба з маленства. Працуе ў садку і адаптацыйная мацярынская школа.

З дзяцінства ўспамінаецца працэс дастаўкі ежы ў старэйшых групах садка. Выхавальніца або сама несла абед у некалькі заходаў, або прасіла каго-небудзь дапамагчы. Тут жа ежа ў кожную групу падымаецца на спецыяльным грузавым ліфце.

— Яшчэ адна адметнасць нашага садка ў тым, што афармленне кожнай групы адрозніваецца ад іншых, — гаворыць **намеснік загадчыцы ДУА «Яслі-сад № 7 г. Ашмяны» па асноўнай дзейнасці Тамара САЎЯНЕНКА.** — Зараз мы знаходзімся ў групе «Божая кароўка».

А ў добрае надвор'е да паслуг дзяцей — казачная гульнявая пляцоўка з сучасным абсталяваннем на добраўпарадкаваным двары. Адным словам — для маленькіх жыхароў Ашмян у новым садку створана ўсё!

Дзіцячы сад — адзін з самых прыгожых будынкаў, узведзеных у Ашмянах за апошнія гады.

Дырэктар Ашмянскага РУП ЖКГ Сяргей БЕЛЯНКОЎ:

«МЫ ВЕЛЬМІ СКРУПУЛЁЗНА ПАДЫХОДЗІМ ДА ПАЖАДАННЯЎ ЖЫХАРОЎ РАЁНА»

Ашмянскае раённае ўнітарнае прадпрыемства ЖКГ абслугоўвае горад Ашмяны і населеныя пункты раёна з насельніцтвам больш за 30 тысяч чалавек. І, трэба сказаць, спраўляецца са сваёй задачай «на выдатна».

Дырэктар Сяргей БЕЛЯНКОЎ.

На станцыі абезжалезвання вады працуюць аператар пульта дыстанцыйнага кіравання Чэслаў МАРКОЎСКІ і слесар-рамонтнік Раман САКАЛОЎСКІ.

«ПЛАНУЕМ ЗАБЯСПЕЧЫЦЬ ГАРАЧАЙ ВАДОЙ УВЕСЬ ГОРАД»

За мінулы год Ашмянскае РУП ЖКГ выканала ўсе асноўныя паказчыкі сацыяльна-эканамічнага развіцця. Вось толькі некаторыя з іх: паказчык па энергазберажэнні — 10,4% (заданне 6%); па эканоміі рэсурсаў — 0,8 (заданне — 0,5), зніжэнне выдаткаў па паслугах насельніцтву — 10,4% (заданне 10%).

— У нас адзін з самых маленькіх у вобласці сабекошт цеплавой энергіі, — кажа **дырэктар Ашмянскага РУП ЖКГ Сяргей БЕЛЯНКОЎ.** — Дасягнулі такога дастаткова сур'ёзнага выніку ў тым ліку і дзякуючы таму, што пабудавалі ў Ашмянах два новыя і вельмі важныя для прадпрыемства і раёна аб'екты. Адзін з іх — кацельня з выкарыстаннем мясцовых відаў паліва. Там устаноўлены два катлы на фрэзерным торфе агульнай магутнасцю 8 МВт. Варта адзначыць, што гэтая кацельня — адна з самых магутных аб'ектаў з выкарыстаннем мясцовых відаў паліва ў Гродзенскай вобласці. Выкарыстанне торфу значна эканоміць рэсурсы: сабекошт адной Гкал цеплавой энергіі меншы, у параўнанні з коштам 1 Гкал на газе, на 16%. Кошт праекта склаў больш за 23 млрд рублёў. Гадавы эканамічны эфект набліжаецца да 5,4 млрд рублёў.

Калі першы праект фінансуецца з абласнога бюджэту, то другі, коштам каля 2 млн еўра, рэалізаваны з прыцягненнем пазыковых сродкаў Міжнароднага банка рэканструкцыі і развіцця. Кацельня з пераўтварэннем у міні-ЦЭЦ з выкарыстаннем газапаршневага рухавіка не толькі ацяпляе дамы, але і выпрацоўвае энергію, як для патрэбнасці сваіх аб'ектаў, так і для продажу. Абсталяванне міні-ЦЭЦ выпрацоўвае ў год 7,7 млн кВт электраэнергіі і 5,5 тыс. Гкал цеплавой энергіі. Такім чынам, прадпрыемства мае магчымасць пакрываць усе свае патрэбы ў электраэнергіі, што дазваляе паменшыць сабекошт 1 Гкал на 10%. У выніку гадавы эканамічны эфект склаў 1,5 млрд рублёў.

— Новая ўстаноўка дазваляе нам у ацяпляльны перыяд забяспечваць гарачай вадой палову насельніцтва горада, — удакладняе Сяргей Белянкоў. — Але на гэтым спыняцца не збіраемся. Сёлета са сродкаў Сусветнага банка рэканструкцыі і развіцця плануем рэалізаваць праект па закальцоўцы сістэмы цеплазабеспячэння, злучыць дзве магутныя кацельні горада. Гэта робіцца для таго, каб сіламі адной кацельні выпрацоўваць энергію на мясцовых відах паліва для забеспячэння гарачай вадой у міжацяпляльны перыяд усяго горада. Мы — субсідзіруемае прадпрыемства. Таму ўсе нашы намаганні накіраваны на змяншэнне сабекошту паслуг, эканомію бюджэтных сродкаў.

РАЗЛІКОВЫ ЦЭНТР ПЕРАЕДЗЕ БЛІЖЭЙ ДА ЛЮДЗЕЙ

Паспяхова рэалізуюцца на Ашмяншчыне праграмы «Устойлівае развіццё вёскі» і «Чыстая вада». За 2013 год Ашмянскае РУП ЖКГ паспела мадэрнізаваць водаправодныя сеткі ў аграгарадках Кракоўка, Кальчуны, пабудаваць станцыю абезжалезвання ў Гальшанах на агульную суму каля 2 млрд рублёў. Цяпер працуюць над рэалізацыяй праекта «Будаўніцтва ачышчальных збудаванняў каналізацыі ў г. Ашмяны. 1-ы пускавы комплекс», а таксама працягваюць весці работу па памяншэнні энергаспажывання. Варта адзначыць, што летась у рамках рэалізацыі праграмы па энергазберажэнні ўдалося атрымаць эканамічны эфект каля 850 Т.У.Т (у грашовым выражэнні — амаль 1,8 млрд рублёў).

— Акрамя гэтага, мы вядзём шчыльную работу з сельскім водазаборам, — распавядае Сяргей Белянкоў. — У нас на балансе каля 70 сельскіх свідравін. Многія з іх ужо выпрацавалі свае рэсурсы. Вада — гэта наша багацце, таму, каб зменшыць энергаспажыванне гэтых свідравін, абследавалі іх і плануем у бліжэйшы час укараніць там новыя тэхналогіі. Таксама праводзім работу па ўкараненні энергаэфектыўнага абсталявання і на нашых цеплакрыніцах, сельскіх кацельнях. Каб зменшыць затраты па цеплаэнергіі, мяняем катлы на менш магутныя.

Наладжана работа ў Ашмянскім раёне і па зборы другасных матэрыяльных рэсурсаў. Заданне па зборы шкла, пластыку, паперы выканалі на 157%. Закупілі і ўстанавілі ў Ашмянах і аграгарадках раёна 120 кантэйнераў розных колераў для збору другасных матэрыяльных рэсурсаў. Адсартаваныя адходы вывозяцца асобным транспартам і здаюцца на перапрацоўку — у выніку атрымліваецца добрая капейка.

— *Сяргей Аляксандравіч, асноўны від дзейнасці ЖКГ — гэта аказанне паслуг насельніцтву. Людзі сёння вельмі патрабавальныя да камунальных службаў. Ці атрымліваецца захоўваць добразычлівыя адносіны?*

— Больш цесна, чым мы, з насельніцтвам працуюць, бадай, толькі ўрачы. Мы ніколі не адмаўляем людзям у тых ці іншых паслугах. Вось цяпер, напрыклад, задумалі перанесці разлікова-касавы цэнтр, які размяшчаецца не ў зусім зручным месцы, у цэнтральную частку горада, на вуліцу Савецкая. Неўзабаве завершым рамонт памяшкання і перасадзім туды сваіх спецыялістаў. Гэта робіцца ў першую чаргу для зручнасці нашых кліентаў. Таксама маем сайт, дзе людзі могуць пакідаць свае пажаданні, прапановы. У нас вельмі добрая служба ЖЭСа з маладымі спецыялістамі, што заўсёды вельмі скрупулёзна падыходзяць да пажаданняў грамадзян, вялікая колькасць якіх звязана з капітальным рамонтам жылля. На жаль, мы, як і ўсе раёны, пакуль абмежаваны ў сродках на гэтыя мэты. Бягучыя рамонты невялікіх аб'ектаў мы праводзім, як правіла, сваімі сіламі, маем сваю будаўнічую брыгаду. Пры неабходнасці дадаткова прыцягваем ашмянскія будаўнічыя арганізацыі.

Чыстыя вуліцы, кветнікі, малыя архітэктурныя формы ствараюць партрэт сённяшняга горада Ашмяны.
Галоўны інжынер ЖКГ Станіслаў ГАЛУЗА і інжынер участка водаканала Аляксандр БАЦЮК.

— Мы заўсёды вельмі актыўна прымаем удзел у добраўпарадкаванні горада, — дадае **намеснік дырэктара Ашмянскага РУП ЖКГ Вячаслаў ЯНКОЎСКІ.** — Так, летась у Ашмянах праходзілі абласныя «Дажынкі». У горадзе ў выніку капітальнага, бягучага рамонту і мадэрнізацыі прыведзены ў парадак фасады будынкаў, выкладзены новыя тратуарныя дарожкі, разбіты прыгожыя газоны. Усяго адрамантавана больш за 20 аб'ектаў на суму 34,5 млрд рублёў. Таксама летась у Ашмянах праходзіў абласны конкурс прафесійнага майстэрства сярод работнікаў зялёнага будаўніцтва «Кветкавыя фарбы». У конкурсе прынялі ўдзел усе прадпрыемствы жыллёва-камунальнай гаспадаркі вобласці. Кветкавыя кампазіцыі, з любоўю зробленыя ўмелымі рукамі камунальнікаў, да гэтага часу цешаць ашмянцаў.

АДЗІН СА СКЛАДНІКАЎ ПОСПЕХУ — ПЛЁННАЯ РАБОТА СПЕЦЫЯЛІСТАЎ

Сацыяльна-эканамічнае развіццё прадпрыемства, стабільнасць у калектыве ў значнай ступені залежаць ад маральна-псіхалагічнага мікраклімату, месца і пазіцыі ў гэтых пытаннях грамадскіх арганізацый, створаных у працоўным калектыве. І гэтая праца ў Ашмянскім РУП ЖКГ арганізавана на належным узроўні. Спартыўная каманда прадпрыемствы летась неаднаразова станавілася пераможцам і прызёрам розных раённых і абласных спаборніцтваў. Традыцыйнымі сталі паходы па рацэ Ашмянка на байдарках. Неаднойчы работнікі ЖКГ пабывалі на розных экскурсіях і ў турыстычных паездках па цікавых мясцінах роднай Беларусі; была арганізавана экскурсія на Чорнае мора на пяць дзён. Кошт пуцёўкі для работнікаў ЖКГ склаў усяго 600 тысяч рублёў. Астатнюю суму даплаціла прадпрыемства. Пры падтрымцы адміністрацыі і прафсаюзнага камітэта штогод арганізуюцца сустрэчы ветэранаў працы, вылучаюцца сродкі для заахвочвання ветэранаў.

Немалая заслуга ў становучай дынаміцы развіцця прадпрыемства належыць дырэктару Ашмянскага РУП ЖКГ. Малады, граматны, патрабавальны да сябе і навакольных, ён зараджае сваёй энергіяй і аптымізмам увесь калектыў.

— Адным са складнікаў поспеху з'яўляецца плённая работа спецыялістаў, глыбокі аналіз выдаткаў, якія мы стараемся мінімізаваць усімі сіламі, нават нягледзячы на няпросты час, — кажа Сяргей Белянкоў. — Патэнцыял развіцця ў прадпрыемства велізарны, калектыў згуртаваны, і задачы, якія ставяцца, нам «па плячы». Мы не збіраемся здаваць пазіцыі, будзем і далей прыкладаць усе сілы для рэалізацыі намечаных планаў, уносіць дастойны ўклад у сацыяльна-эканамічнае развіццё нашага Ашмянскага раёна.

УНП 500057325

Ашмянская каўбаска — проста казка

Сябры наведалі знакаміты фестываль «Гальшанскі замак» і вельмі нахвальвалі шашлыкі, якія давялося там пакаштаваць. Як высветлілася, іх вось ужо шмат гадоў па ўнікальнай тэхналогіі вырабляе адно са старэйшых прадпрыемстваў нашай рэспублікі ААТ «Ашмянскі мясакамбінат». Апошні, дарэчы, славіцца не толькі сваімі смачнымі паўфабрыкатамі, але і знатнымі мяснымі далікатэсамі: сыравэнджанымі каўбасамі, вяндлінай, балыкамі, паляндвіцай, якія з'яўляюцца неад'емным упрыгажэннем любога святочнага стала.

Шырокі асартымент мясных вырабаў і паўфабрыкатаў характэрны для ўсіх крамаў фірменнага гандлю Ашмянскага мясакамбіната. Гэты фотаздымак зроблены ў цэнтры Ашмян. Крама размясцілася на другім паверсе адрамантаванага будынка, які быў пабудаваны ў 1913 годзе. Прыгожы інтэр'ер, ветлівае абслугоўванне і, галоўнае, поўныя вітрыны прынеслі гэтаму магазіну заслужаную папулярнасць. У поле зроку аб'ектыва — прадаўцы шостага разраду Ларыса БУТКЕВІЧ і Міхаіл КАТКОЎСКІ.

ЯКАСЦЬ НА ПЕРШЫМ МЕСЦЫ

Ашмянскія прысмакі адрозніваюцца не толькі сваім цудоўным смакам, але і высокай якасцю. Апошняя не раз пацвярджалася шматлікімі ўзнагародамі. «Звязда» пра поспехі калектыву мясакамбіната ведае не па чутках, бо расказвала пра іх неаднаразова. Вось і на гэты раз, калі прыехалі на прадпрыемства, ад душы парадаваліся, убачыўшы ў кабінеце дырэктара Тамары Уладзіміраўны Філіповіч новую заслужаную ўзнагароду. Сёлета ААТ «Ашмянскі мясакамбінат» атрымаў прэмію ўрада за дасягненне ў галіне якасці.

Паводле слоў дырэктара ААТ «Ашмянскі мясакамбінат», якасць на прадпрыемстве ва ўсе часы — на першым месцы, бо пакупнікі павінны быць цалкам перакананы ў бяспецы прадуктаў. «І ў нашых пакупнікоў такая ўпэўненасць ёсць», — адзначае Тамара Уладзіміраўна. Аб гэтым сведчыць папулярнасць, якой карыстаюцца мясныя вырабы Ашмянскага мясакамбіната.

Галоўная ж перавага ашмянскай прадукцыі ў тым, што тут выкарыстоўваецца сыравіна з аднаго з самых экалагічна чыстых рэгіёнаў краіны. А багатыя традыцыя гандлёвай маркі «З павагай да якасці» вось ужо 114 гадоў спалучаюцца з самым сучасным высокатэхналагічным абсталяваннем і тэхналогіямі.

У 2014 годзе ААТ «Ашмянскі мясакамбінат» атрымаў прэмію ўрада за дасягненне ў галіне якасці.

— На мой погляд, ёсць чатыры складнікі, якія зрабілі наш брэнд «З павагай да якасці» шырока вядомым як у Беларусі, так і за яе межамі, — кажа Тамара Філіповіч. — Першае — высокі тэхналагічны ўзровень вытворчасці на ўсіх этапах. Прадпрыемства няспынна павялічвае магутнасці сваіх цэхаў: у прыватнасці, магутнасці мяса-тлушчавага цэха асвоены на 220%, цэху сыравэнджаных каўбас — на 160%. Шмат магчымасцяў дала мадэрнізацыя, якую мы распачалі на мясакамбінаце яшчэ ў канцы 1990-х гадоў. За гэты час пабудаваны база перадзабойнага ўтрымання жывёлы, мяса-тлушчавы цэх, каўбасны цэх, цэх паўфабрыкатаў, цэх сыравэнджаных каўбас, лабараторыя, кацельня, аўтамайстэрня. Развітую лагістычную інфраструктуру забяспечвае ўласны аўтапарк. Усяго ў распараджэнні ААТ «Ашмянскі мясакамбінат» 47 аўтамабіляў — гэта ізатэрмічныя аўтафургоны (з холадазабеспячэннем).

Вельмі аператыўна абнавілі абсталяванне і сёння прымяняем тэхналогіі, якія дазваляюць захаваць у мясе вітаміны, бялкі і іншыя кампаненты высокай біялагічнай і харчовай каштоўнасці. У межах праграмы развіцця малых населеных пунктаў пабудавалі сучасны халадзільнік, у якім можна захоўваць адначасова 500 тон мяса. Рэканструкцыя цэхаў з пашырэннем вытворчых плошчаў і ўстаноўка новага абсталявання дазваляюць павялічыць асартымент, аб'ёмы і павысіць якасць прадукцыі. Другое — кантроль якасці ў адпаведнасці з міжнароднымі стандартамі. У лабараторыі камбіната працуюць выключна высокакваліфікаваныя спецыялісты. Трэцяе — якасная сыравінная база. І чацвёртае, бадай, самае вызначальнае — добрасумленная, кваліфікаваная праца кожнага работніка на сваім участку.

На прадпрыемстве сёння працуе звыш 800 чалавек. Пры гэтым, што немалаважна, пастаянна ствараюцца новыя працоўныя месцы. Варта адзначыць, што дырэктар Ашмянскага мясакамбіната Тамара Уладзіміраўна Філіповіч, якая на гэтай пасадзе звыш 30 гадоў, клапоціцца пра сваіх работнікаў. На прадпрыемстве створаны ўсе ўмовы для працы і адпачынку. Ёсць медпункт з фізіятэрапеўтычным кабінетам, трэнажорная зала, лазня, свой вакальна-інструментальны ансамбль «Ашмянскія волаты», ладзяцца экскурсіі і канцэрты. А ведаеце вы, колькі дагледжаная тэрыторыя вакол мясакамбіната: столькі кветак я не бачыла яшчэ ні на адным з аналагічных прадпрыемстваў. Не кажу ўжо пра вытворчыя памяшканні, у афармленні якіх адлюстравана тэма гісторыі мясакамбіната, у калідорах вісяць маляўнічыя фотаздымкі з краявідамі Ашмянскага краю, зробленыя самім дырэктарам, дзякуючы якім у тым ліку, як прызналіся работнікі, яны прыходзяць на свае працоўныя месцы ў добрым настроі.

Знаёмцеся: працаўнікі мясакамбіната Ірына ПАДВОРСКАЯ, Алена СУБАЧ, Вольга ТАРАСЮК, Жанна МАРЦІНКЕВІЧ, Віктар КОДЗЬ, Вячаслаў ЧАЙКА, Генадзь АНТОНІК, Андрэй ПАЎЛЮКОВІЧ, Іван МІЕЎСКІ, Аляксандр МАРЦІНКЕВІЧ, Віктар ЦЫРАШКЕВІЧ, Анатоль ЗАЯНЧКОЎСКІ. Адны з іх працуюць тут не адзін год, другія прыйшлі ў калектыў зусім нядаўна дзякуючы стварэнню на прадпрыемстве новых рабочых месцаў. Здымак зроблены ў адным з маляўнічых куточкаў на вытворчай тэрыторыі.

НЕ ТОЛЬКІ СМАЧНА, АЛЕ І КАРЫСНА

На Ашмянскім мясакамбінаце вельмі шануюць традыцыі. Аб гэтым сведчыць і тое, што многія мясныя вырабы гатуюцца па рэцэптах, праверaных часам, якія спецыялісты камбіната беражліва захоўвалі многія гады. Разам з тым, тэхналагі прадпрыемства здзіўляюць пакупнікоў і новымі распрацоўкамі.

Так, ноу-хау Ашмянскага мясакамбіната з'яўляюцца вырабы з дабаўленнем лафанту анісавага і пчалінага мёду, якія надаюць каўбасам неверагодна духмяны і адметны пах.

— Лінейку гэтых вырабаў спецыялісты мясакамбіната распрацавалі сумесна з Навукова-практычным цэнтрам па харчаванні Акадэміі навук, — распавядае **вядучы маркетолаг ААТ «Ашмянскі мясакамбінат» Таццяна ЯКУШАВА.** — У іх, акрамя свініны і ялавічыны, атрыманых у экалагічна чыстым рэгіёне, выкарыстоўваюцца мясцовыя карысныя расліны. У прыватнасці, пчаліны мёд і лафант анісавы, які па сваіх якасцях аналагічны жэньшэню. Ашмянскі мясакамбінат мае пчальнік, лафант жа на прадпрыемства пастаўляе мясцовы фермер.

Значнае месца ў дзейнасці мясакамбіната займаюць сацыяльныя праграмы. Так, 7 гадоў таму адным з першых у краіне Ашмянскі мясакамбінат узяў на сябе арганізацыю дзіцячага харчавання ў школах.

НАШЫ ДАСЯГНЕННІ

Прадукцыя ААТ «Ашмянскі мясакамбінат» пастаянна займае прызавыя месцы на самых розных конкурсах. Так, летась на конкурсе «Лепшая прадукцыя года» адзначыліся каўбаскі паўвэнджаныя «Паляўнічыя», салямі сыравэнджаная «Венгерская», прадукт са свініны сыравэнджаны «Палачкі да піва вытанчаныя». Званне «Чэмпіён смаку» (так называецца конкурс-дэгустацыя. — Аўт.) атрымала каўбаса салямі сыравэнджаная «Баварская новая».

— Сёння ўзбагачаныя вітамінізаваныя мясныя паўфабрыкаты ўключаны ў рацыён больш чым 4,5 тысячы школьнікаў Ашмян, Астравецкага і Смаргонскага раёнаў, — распавядае Тамара Філіповіч. — Разнастайныя паўфабрыкаты з рубленага мяса тэхнолагі мясакамбіната распрацавалі спецыяльна для дзіцячага харчавання.

Напрыклад, катлета «Школьная», у склад якой уваходзіць лактулоза, што дапамагае ўзнавіць кішэчную мікрафлору, катлеты «Здравушка» з марской капустай, якая з'яўляецца крыніцай ёду, сасіскі «Малочныя» вышэйшага гатунку, тэфтэлі «Казка» і шмат іншага. Харчаваннем задаволены ўсе. Бацькі рады, што кошт значна патаннеў, бо на сваю прадукцыю прадпрыемства не бярэ нацэнку. Дзецям падабаецца смаката, прыгатаваная кухарамі, якія дарэчы, уваходзяць у штат мясакамбіната.

Клапоціцца дырэктар камбіната і пра здароўе сваіх работнікаў. На мясакамбінаце ёсць утульная сталовая, дзе гарачыя паўнавартасныя абеды ў дзве змены работнікі атрымліваюць бясплатна. Да паслуг тых, хто працуе ў начную змену, — буфет, дзе можна таксама бясплатна выпіць кубачак гарачай гарбаты ці кавы.

Рабочая сталовая мясакамбіната размешчана ў прасторным памяшканні. Да смачнага і таннага гарачага харчавання супрацоўнікі дадаткова могуць набыць у буфеце цукеркі, печыва і сокі.

У «ПАЧАСТУНАК» — ПА ПАЧАСТУНАК

Прадукцыю з лагатыпам Ашмянскага мясакамбіната можна сустрэць больш чым у 500 гандлёвых аб'ектах. 20% мясных вырабаў рэалізуюцца праз уласны фірменны гандаль: крамы з мілагучнай беларускамоўнай назвай «Пачастунак» можна наведаць у Гродне, Шчучыне, Наваельні, Астраўцы, Смаргоні, Ашмянах, Іўі і Мінску. Пакуль што іх 23, але сёлета плануецца адкрыць яшчэ чатыры: дзве ў Смаргоні, і па адной у Іўі і Астраўцы.

На свае вочы пераканаліся, што ў фірменных крамах ААТ «Ашмянскі мясакамбінат» можна знайсці багаты асартымент мясных вырабаў на ўсе выпадкі жыцця, што немалаважна, з мінімальнымі гандлёвымі надбаўкамі.

Цяпер найбольшым попытам карыстаюцца сыравэнджаныя каўбасы «Мядовая», «Беларуская», «Крамлёўская», «Духмяная», «Славянская», «Хутарская», «Святочная», «Дамашняя», «Ласунак апетытны» ды шашлык «Дачны». Гэта зразумела, людзі едуць на лецішча, у адпачынак, таму і запасаюцца прадуктамі, якія даўжэй захоўваюцца.

Мясакамбінат вырабляе шырокі асартымент разнастайных каўбасных вырабаў, мясных далікатэсаў і паўфабрыкатаў. Каб не разгубіцца і хутчэй зрабіць выбар, звяртайцеся да прадаўцоў, якія з'яўляюцца сапраўднымі «патрыётамі» прадукцыі, што прадаюць. Яны ахвотна дапамогуць зарыентавацца ў вялікай колькасці ашмянскіх пачастункаў.

УНП 500057139

СЫРНЫЙ РАЙ

СЫРНАЯ ЖАР-ПТУШКА ЖЫВЕ ТУТ

АШМЯНСКІ СЫРАРОБНЫ ЗАВОД:
ЗАЛОГ ПОСПЕХУ — У НЯСПЫННАЙ МАДЭРНІЗАЦЫІ

Тут працуе аператар вытворчасці сыру Артур МАРКОЎСКІ.

Гонар Ашмян — мясцовы сыраробны завод, прадукцыя якога добра вядома далёка за межамі Беларусі. Гэта і ёсць прыклад таго, якім павінна быць сучаснае дзяржаўнае прадпрыемства — з паспяховым збытам выпрацаванай прадукцыі, дзякуючы чаму забяспечваюцца годныя заробкі супрацоўнікаў, а завод мае неблагую рэнтабельнасць і няспынна мадэрнізуецца. Пра тое, як прадпрыемства прыстасоўваецца да ўмоў, якія дыктуе бязлітасны рынак, расказаў у інтэрв'ю выканаўца абавязкаў дырэктара Ашмянскага сыраробнага завода, філіяла ААТ «Лідскі малочна-кансервавы камбінат» Станіслаў РАЦІНА.

Выканаўца абавязкаў дырэктара прадпрыемства Станіслаў РАЦІНА.

Старшы майстар Іна ГРЫШЧАНКАВА паказала нам памяшканне, дзе саспяваюць вядомыя ашмянскія сыры.

МАДЭРНІЗАЦЫЯ ІДЗЕ ЗАЎСЁДЫ

— Сёлета споўнілася 48 гадоў ад таго часу, як быў запушчаны масласырзавод у Ашмянах. Тады мы за суткі маглі перапрацаваць усяго 20 тон малака. У тыя часы мы забяспечвалі спажывецкі попыт на сыр, малако і цэльнамалочную прадукцыю.

Патрэбы насельніцтва ў малочных прадуктах узрасталі, і паступова завод павялічыў магутнасці перапрацоўкі ў два з паловай разы. Першую мадэрнізацыю завод зазнаў яшчэ ў 1980-я гады. Было пабудавана новае прыёмна-мыйнае аддзяленне, а кацельня была пераведзена з цвёрдага на вадкае паліва.

Другая ж глабальная мадэрнізацыя на заводзе пачалася ў 2006 годзе. Тады была рэалізавана першая чарга інвестыцыйнага праекта «Мадэрнізацыя цэха па выпрацоўцы цвёрдых сыроў». Цяпер мы выкарыстоўваем перадавыя сусветныя тэхналогіі. Ужываем толькі высакаякасныя кампаненты еўрапейскіх вытворцаў з выдатнай рэпутацыяй. Гэта дазваляе нам паспяхова канкурыраваць з прызнанымі ў Старым Свеце майстрамі сыраробнай справы: Нідэрландамі, Літвой, Польшчай, Фінляндыяй і Украінай.

Так, участак па выпрацоўцы цвёрдых сыроў прайшоў праз сапраўдную рэканструкцыю. Мы закупілі і ўстанавілі новую аўтаматычную лінію польскай вытворчасці маркі OBRAM, з дапамогай якой здолелі перапрацоўваць за суткі ўжо 180 тон малака і выдаваць 15 тон цвёрдых сыроў тыпаў «Расійскага» і «Галандскага». Лінія дазваляе забяспечыць аўтаматычны выпуск сыру, пры гэтым усе працэсы кантралююцца з дапамогай камп'ютара. Тады ж вытворчы працэс істотна дапамагла палепшыць італьянская бактафуга фірмы Frautech s.r.l. Дзякуючы ёй удаецца дабівацца вельмі высокай ступені ачысткі малака. Каэфіцыент выдалення перавышае 90.

Цяпер на заводзе праводзіцца рэканструкцыя кацельні з усталяваннем новых сучасных катлоў з вялікім каэфіцыентам карыснай дзейнасці нямецкай вытворчасці фірмы Bosch. Падчас мадэрнізацыі была ўстаноўлена новая кампрэсарная, мы цалкам пазбавіліся ад састарэлай аміячнай тэхналогіі, якая засталася нам у спадчыну ад савецкіх часоў. Цяпер жа ў нас ёсць вольныя вытворчыя пляцоўкі. Але пуставаць яны не будуць. Іх мы плануем аснасціць новым сучасным абсталяваннем іспанскай кампаніі CORPORACION FIBOSA INTERNACIONAL. На ім мы здолеем выпускаць яшчэ больш відаў сыроў. Наш кантракт з іспанцамі ацэньваецца ў 4 мільёны 585 тысяч еўра. Ужо праведзена працэдура закупкі, узгаднення. Мы зрабілі папярэднюю аплату, і зусім хутка да нас прыедуць і ўсталююць лінію іспанскія калегі. Сусветны рынак сыроў вельмі насычаны, і адставаць ад яго мы не маем права: нас тут жа пачнуць выцясняць канкурэнты.

А гэта значыць, што істотна павялічыўся каталог нашай сырнай прадукцыі 30 гадоў таму абмяжоўваўся толькі дзвюма пазіцыямі. Гэта быў сыр «Расійскі» з тлустасцю 50% і нятлусты сыр для прамысловай перапрацоўкі. Затое цяпер з цэхаў завода пад маркай «Сырны рай» выходзяць тры дзясяткі сыроў, якія даўно прыйшліся даспадобы пакупнікам. Тлустасць іх — на любы густ, ад 19 да 55%. Паспяваюць яны на працягу 10-60 сутак. Выключна мясцовай распрацоўкай стаў гатунак сыру «Князь Гольша».

— На смак гэты сыр чымсьці аддалена напамінае знакаміты «Расійскі...»

— Так. Але пры гэтым ён таннейшы і смачнейшы. Акрамя таго, мы ў назву сыру пастараліся ўкласці часцінку нашай гісторыі. Яна наўпрост звязана з Гальшанскім замкам, які калісьці зрабіў вядомым на ўвесь свет Уладзімір Караткевіч. Замак гэты знаходзіцца зусім недалёка ад Ашмян...

Начальнік вытворчага сектара Святлана МАКАРЭВІЧ — адна з тых, хто працуе на прадпрыемстве даўно і плённа.

СА СКАРБОНКІ ЎЗНАГАРОД

2010 год. Дыплом «За актыўны ўдзел у выставе-кірмашы беларускіх таваравытворцаў» у Валгаградзе.

2012 год. Гран-пры за стабільную якасць на конкурсе «Лепшая прадукцыя года».

2012 год. Пераможца грамадскага конкурсу «Лепшая прадукцыя года» ў намінацыі «Сыры сычужныя».

2013 год. Удзельнік праграмы «100 лепшых тавараў Расіі», лаўрэат конкурсу «Лепшыя тавары Рэспублікі Беларусь на рынку Расійскай Федэрацыі».

2013 год. Гран-пры за стабільную якасць на конкурсе «Лепшая прадукцыя года».

Прадукцыя Ашмянскага сыраробнага завода атрымала сертыфікаты па многіх міжнародных сістэмах. Гэта і менеджмент якасці, які адпавядае міжнароднаму стандарту СТБ ISO 9001-2009, і кіраванне якасцю і бяспекай харчовых прадуктаў на падставе аналізу рызыкі і крытычных пунктаў (HACCP), і міжнародны экалагічны сертыфікат СТБ ISO 14001. А ўсё гэта, у сваю чаргу, сведчыць пра тое, што прадукцыя Ашмянскага сыраробнага завода адпавядае сусветным крытэрыям якасці.

Пасля таго, як на прадпрыемстве запрацуе новая іспанская лінія, да лінейкі існуючых сыроў далучыцца сыр тыпу Oltermanni. Наш аддзел маркетынгу дасканальна вывучыў спажывецкі попыт і прыйшоў да высновы, што лепш спыніцца на дробнай фасоўцы ў 350 грамаў. Менавіта таму ён будзе ад пачатку рознічным таварам, у адрозненне ад традыцыйных відаў сыроў, якія пастаўляюцца, як правіла, у буйных галоўках. У фірменнай упакоўцы заводавытворцы ён хутчэй трапіць на прылаўкі магазінаў і, як вынік, да канчатковага спажыўца.

— А ці плануе прадпрыемства выпускаць далікатэсныя віды сыроў?

— Тэхналагічна рабіць мы гэта можам. Летась мы вырабілі па адной варцы (прыкладна па адной тоне) пяць відаў такіх сыроў: з часнаком, з папрыкай, з пажытнікам, з вясенніім зяленівам. Пакаштаваць іх можна было на сырным фэсце ў Гродне. І больш за ўсіх наведнікам сырнай феерыі спадабаўся менавіта сыр з пажытнікам. Але ў існуючых эканамічных умовах займацца масавай вытворчасцю далікатэсных сыроў нам нявыгадна. Па-першае, на яго на расійскім рынку, не кажучы ўжо аб беларускім, існуе не вельмі вялікі попыт, і таму яго кошт аўтаматычна падрастае. Значыць, ён па кішэні будзе даступны ўжо не кожнаму. А працаваць на склад мы не хочам, бо страцім укладзеныя грошы. Па-другое, існуюць асаблівасці тэхналагічнага працэсу пры вытворчасці, напрыклад, сыру з пажытнікам, ад якіх адысці немагчыма. Робіцца ён апошняй варкай, і пасля гэтага трэба мыць абсталяванне. Але калі сітуацыя на рынку перамяніцца, дык чаму б тады не пайсці з ім у нагу?

За пастэрызацыяй малака сочыць апаратчыца Наталля ЯНЧ.

Майстар сыраробнага ўчастка Вольга ЗАВАДСКАЯ.

ДЗЕ КУПІЦЬ АШМЯНСКІ СЫР?

— На жаль, знайсці прадукцыю сыраробаў з Ашмян у айчыннай рознічнай сетцы гандлю цяжкавата. На ўнутраны беларускі рынак адпраўляецца сёння прыкладна 6-8% выпушчанай заводам прадукцыі. Знайсці яе можна пераважна ў мясцовым гандлі і ў Мінску — значная частка вырабаў рэалізуецца праз вядомую ўсім сетку «Еўраопт».

А вось больш за 90 працэнтаў нашых вырабаў адпраўляецца на велізарны расійскі рынак. Геаграфія найбуйнейшых паставак, на першы погляд, не вельмі разнастайная — Масква, Санкт-Пецярбург ды Варонеж. Аднак яна з лішкам кампенсуецца шматмільённым насельніцтвам гэтых гарадоў. Можна сустрэць ашмянскія сыры і на прылаўках крам, якія знаходзяцца ў Калінінградскай вобласці. Але ў гэтым нічога дзіўнага няма, калі зірнуць на карту — нам тут дапамагае адносная геаграфічная блізасць самага заходняга рэгіёна Расіі.

Першая сустракае машыны з малочнатаварных комплексаў і фермаў прыёмшчыца малака Марына БЛАЖЫЕЎСКАЯ.

ПАСПЯХОВАЯ АДАПТАЦЫЯ ДА ЎМОЎ РЫНКУ

— А вось выпуск цэльнамалочнай прадукцыі быў згорнуты яшчэ ў 2009 годзе. Нашы маркетолагі, вывучыўшы сітуацыю на рынку, прыйшлі да высновы, што больш рабіць яе няма сэнсу. Па-першае, попыт на яе стаў ужо не такі вялікі, як раней. Па-другое, з-за гэтага вытворчасць цэльнамалочнай прадукцыі прыносіла нам істотныя страты. Рэнтабельнасць яе на заводзе складала мінус 15 працэнтаў. Да таго ж было немэтазгодна канкураваць са сваімі. Атрымлівалася, што фактычна мы датавалі яе выпуск за кошт сыроў. Ад гэтай палітыкі мы вырашылі адмовіцца. Цэх, які выпускаў цэльнамалочную прадукцыю, быў закрыты. На яго месцы паўстаў новы маслацэх па вытворчасці масла сучасным метадам перапрацоўкі высакатлустых вяршкоў.

Два гады таму мы актыўна ўзяліся за перапрацоўку сыроваткі, якую раней адпускалі мясцовым гаспадаркам. Для гэтага мы пабудавалі спецыяльны цэх. Перапрацоўка і згушчэнне сыроваткі ў ім вядзецца метадам нанафільтрацыі на абсталяванні польскай вытворчасці. Прадукцыю мы адпраўляем на экспарт — як вынік, атрымліваем дадатковую валютную выручку. Мы разлічвалі, што лінія па вытворчасці сыроваткі акупіцца за тры гады. Але нам удалося зрабіць гэта за два.

ІМІ ГАНАРЫЦЦА ПРАДПРЫЕМСТВА

ЧАЙКА Станіслава, начальнік сырнага цэха. Зараз яна з'яўляецца найстарэйшай супрацоўніцай завода — працы на ім яна аддала 42 гады. Працавала заквасачніцай, майстрам, працяглы час узначальвала прафсаюзны камітэт.

МАКАРЭВІЧ Святлана, начальнік вытворчага сектара. Адпрацавала на заводзе 32 гады.

ЧЫРКОЎ Уладзімір, газаэлектразваршчык. Працоўны стаж на заводзе — 42 гады.

ДЗЕНІСЕНКА Ірына, апаратчыца прыёмна-апаратнага цэха.

ГАНЧАРЫК Святлана, інжынер-мікрабіёлаг.

Ёсць на Ашмянскім сыраробным заводзе і сапраўдная працоўная дынастыя **СТАНКЕВІЧАЎ-ЛІТВІНОВІЧАЎ.**

ФІНАНСАВЫ ДАБРАБЫТ ПРАДПРЫЕМСТВА

Сёння на прадпрыемстве працуюць 205 чалавек, што даволі істотна для 15-тысячнага горада. Высокакваліфікаваныя кадры ведаюць і любяць сваю справу.

— Ашмянскі сыраробны завод — філіял ААТ «Лідскі малочна-кансервавы камбінат» — стала працуе «ў плюс», — гаворыць галоўны бухгалтар прадпрыемства Вольга Ганусевіч. — Рэнтабельнасць продажу склала сёлета за першыя тры месяцы 8,7%. Адметна, што за такі ж прамежак часу летась рэнтабельнасць была ніжэйшай на 0,4%. Упэўнена расце і рэнтабельнасць рэалізаванай прадукцыі прадпрыемства — з 9,2% да 9,8%. Чысты прыбытак дасягнуў адзнакі ў 5 мільярдаў 582 мільёны супраць 2 мільярдаў 158 мільёнаў рублёў летась. Ад рэалізацыі прадукцыі мы выручылі 90 мільярдаў 380 мільёнаў рублёў, перавысіўшы планавы паказчык на 18,6%.

Паколькі для нас вельмі важны экспартны складнік, мы зацікаўлены ў тым, каб як мага больш прадукцыі адпраўлялася за мяжу. І пакупнікі нам давяраюць. Лепш за ўсё пра гэта сведчыць аб'ём экспарту, які няспынна павялічваецца. Калі за першы квартал летась мы адправілі прадукцыі ў Расію на суму 6 мільёнаў 101 тысяча долараў, то сёлета ўжо на 26 тысяч долараў больш. Агульная ж выручка ад рэалізацыі прадукцыі за студзень, люты і сакавік дасягнула адзнакі ў 90 мільярдаў 380 мільёнаў рублёў супраць 65 мільярдаў 24 мільёнаў рублёў летась.

УНП 500837843

АСАРТЫМЕНТ ПРАДУКЦЫІ

Цяпер наш асноўны від прадукцыі — гэта сыры (як цвёрдыя сычужныя, так і паўцвёрдыя) ды масла. У гэта цяжка паверыць, але

Каля вялікіх ёмістасцяў, дзе сыр атрымлівае неабходную колькасць солі, упраўляецца Валянціна МАЦКОЙЦЬ.

АРМЯНСКАЯ САЛОМКА З АШМЯНСКАЙ КРАКОЎКІ

СЁЛЕТА ПАД АШМЯНАМІ ПАЧНУЦЬ ВЫРАБЛЯЦЬ ЯШЧЭ І АРМЯНСКІЯ КРУАСАНЫ

Тое, што Ашмянскі раён прывабны для бізнесу, пацвердзілі і армянскія інвестары, з якімі мы сустрэліся ў некалькіх кіламетрах ад Ашмян. Тут, у аграгарадку Кракоўка, яны пры падтрымцы мясцовай улады заснавалі замежнае таварыства з абмежаванай адказнасцю «Унісон груп» і вось ужо тры гады вырабляюць кандытарскія вырабы, якія сярод беларусаў карыстаюцца надзвычайнай папулярнасцю.

Перш чым распавесці пра поспехі, якіх дасягнула маладое прадпрыемства, **адзін з заснавальнікаў ЗТАА «Унісон груп» Вардан АМІР'ЯН** частуе салёнай саломкай і ванільнымі сушкамі.

— Любыя дзелавыя перамовы абавязкова пачынаем з дэгустацыі ўласнай падукцыі. Бо, згадзіцеся, лепш адзін раз пакаштаваць, чым сто разоў пачуць, — усміхаецца Вардан Альбертавіч. — Нам не сорамна за сваю «кандытарку». Самі з задавальненнем яе ядзім і ўсім раім.

Саломка і сушкі, сапраўды, без перабольшвання, вельмі смачныя. Акрамя таго, якасныя (без кансервантаў), і недарагія. Не дзіўна, што армянскія вытворцы за такі кароткі час ужо паспелі заваяваць папулярнасць сярод беларускіх пакупнікоў.

— Праблем са збытам зусім не маем, — адзначае **старшыня савета дырэктароў ЗТАА «Унісон груп» Віталь ШАБЛОЎСКІ.** — Найбольш актыўна працуем з мінскімі «Еўраоптамі». У нас столькі заказаў, што нават фізічна не паспяваем іх выконваць. Менавіта таму задумалі расшырацца. Да восені плануем запусціць другую лінію, ужо новыя печкі закупілі. Тым больш што мясцовыя ўлады пайшлі нам насустрач і выдзелілі яшчэ адно памяшканне, па памеры прыкладна такое ж, як гэта. Сёння мы гатовы пастаўляць на беларускі рынак толькі сушак да 100 тон за месяц.

Варта адзначыць, што армянскія сушкі ды саломка вырабляюцца цалкам з беларускай сыравіны: лідскай мукі, ашмянскіх дражджэй і вады, айчынных маргарыну, цукру і солі. Саломка фасуецца ў пакеты (дарэчы, таксама беларускай вытворчасці) па 40 грамаў, сушкі ў кардонныя пачкі па 600 грамаў. З замежнага — толькі абсталяванне, тэхналогіі ды рэцэптура, праверaная 15-гадовым вопытам.

Укладаць інвестыцыі менавіта ў кандытарскую вытворчасць армянскія бізнесмены вырашылі невыпадкова. Партнёры маюць аналагічнае прадпрыемства ў сябе на радзіме, у Арменіі.

— У Ерэване ў нас ёсць уласная кандытарская фабрыка, — распавядае Вардан Амір'ян. — Выпускаем там шмат розных відаў мучных вырабаў. У будучыні плануем і ў Беларусі пашырыць вытворчасць да такіх памераў. Планы ў нас сур'ёзныя. Але ўсё трэба рабіць паступова. У бліжэйшы час плануем, акрамя салёнай саломкі, выпускаць салодкую, ванільную. Таксама прывязём новае абсталяванне і ўжо восенню гэтага года, думаю, пачнём выпякаць круасаны з рознымі начынкамі (ванільнай, шакаладнай, са згушчанага малака) ды пясочнае пячэнне з джэмам. Наша задача — прапанаваць беларускаму спажыўцу танны і адначасова якасны прадукт.

— Далейшае развіццё прадпрыемства, вядома, будзе спрыяць стварэнню новых працоўных месцаў для мясцовых жыхароў. Для іх на вытворчасці створаны неабходныя ўмовы не толькі для працы, але і прыёму ежы, а таксама адпачынку.

— Ужо сёння мы працаўладкавалі 42 чалавекі, — кажа Вардан Амір'ян. — З пашырэннем вытворчых плошчаў плануем стварыць працоўныя месцы яшчэ як мінімум для такой жа колькасці мясцовых жыхароў. Усіх работнікаў абучаем. Для гэтага прыязджаюць нашы тэхнолагі з Ерэвана. І на адлегласці яны таксама сочаць за тым, як выконваюцца тэхналогіі: пастаянна праводзяць кансультацыі па «скайпе».

— Чаму вы вырашылі развіваць свой бізнес менавіта ў Беларусі? — пацікавілася я на развітанне.

— Аб развіцці ўласнай справы ў іншай краіне мы з партнёрам задумваліся даўно, — кажа Вардан Амір'ян. — Узважвалі ўсе «за» і «супраць», параўноўвалі ўмовы развіцця бізнесу ў розных краінах. У пошуках найлепшых умоў для замежных інвестараў мы аб'ехалі ўсе краіны СНД. У выніку спыніліся на Беларусі. Тры гады прайшло з таго часу, але мы ні разу не пашкадавалі аб сваім выбары.

— А чаму сярод усіх рэгіёнаў нашай краіны аддалі перавагу Ашмянскаму?

— Бо Ашмяны знаходзяцца непадалёку ад мяжы з Еўрасаюзам. Мы ж з самага пачатку планавалі пасля таго, як асвоім беларускі рынак, пастаўляць сваю кандытарскую прадукцыю і на экспарт. Цяпер вось рыхтуем кантракт на пастаўку 20 тон вырабаў у Расію. Вядзём перамовы з Аўстраліяй, Амерыкай. Хачу сказаць, нам вельмі пашанцавала з раёнам, у які мы ўкладаем свае інвестыцыі. Мясцовыя ўлады з першага дня аказваюць нам падтрымку і дапамогу ў развіцці сваёй справы. Тут на высокім узроўні пастаўлена работа райвыканкама з інвестарамі. Усе пытанні вырашаюцца хутка, праекты ўзгадняюцца без затрымак. Без гэтага ў нас не атрымалася б дасягнуць такога поспеху, бо не сакрэт, што менавіта сімбіёз работы прыватнага капіталу і дзяржаўнай падтрымкі дае самы лепшы вынік.

ЦІКАВА ВЕДАЦЬ!

Мучны сімвал цудоўнага выратавання

А ці ведаеце вы, што круасан — гэта нацыянальны сімвал Францыі? Праўда, кажуць, французы запазычылі рэцэпт гэтай булачкі ў аўстрыйцаў, невыпадкова круасаны таксама называюць венскай выпечкай. Згодна з легендай, у 1683 годзе Вене даводзілася вельмі несалодка пад націскам турак, якія некалькі месяцаў трымалі горад у аблозе. Паколькі венцы ўсё-такі былі не гатовы здавацца, туркі вырашылі пайсці на крайнія меры і зрабіць падкоп пад сцяной горада, каб пракрасціся ў яго незаўважна. Аднак ім перашкодзілі... хто б вы думалі? Пекары. Людзі гэтай прафесіі працуюць, калі ўсе астатнія яшчэ спяць, каб да раніцы прыгатаваць свежую выпечку. Дык вось, працуючы ноччу, некаторыя пекары пачулі дзіўныя гукі турэцкіх капальнікаў і папярэдзілі ўлады горада. Апошнія паспелі прыняць меры і прадухіліць нечаканы захоп. А тут і падмацаванне з Польшчы падышло, Вена была выратавана. Тыя самыя пекары з радасці спяклі булачкі ў выглядзе паўмесяцаў — такіх, якія яны бачылі на турэцкіх сцягах.

А круасанамі гэтыя булачкі сталі толькі ў 1770 годзе, калі Марыя Антуанета, 15-гадовая аўстрыйская прынцэса, прыехала ў Парыж, каб выйсці замуж за Людовіка XVI. У гонар сваёй новай каралевы парыжскія булачнікі спяклі «круасаны» («месяц» па-французску).

Марская соль больш карысная, чым звычайная

Салёные палачкі, якія вырабляе прадпрыемства «Унісон груп», пасыпаюць марской соллю. Марская соль здабываецца натуральным шляхам: вада на сонцы выпараецца, і ўтвараюцца крышталі солі. Лепшую марскую соль здабываюць у Францыі, Англіі, Ізраілі і на Гаваях.

Марская соль, у адрозненне ад звычайнай сталовай, не складаецца выключна з хларыду натрыю, а змяшчае ў сабе і іншыя мікраэлементы: калій, натрый, кальцый, магній, жалеза, бром, хлор, марганец, цынк, селен, медзь, крэмній і ёд. Дзякуючы брому і магнію, марская соль выводзіць лішнюю вадкасць з арганізма, а таксама зніжае ўнутрычарапны ціск, а значыць, пазбаўляе ад галаўнога болю. Калій падтрымлівае нармальны ціск крыві, папярэджваючы развіццё гіпертаніі, пазбаўляе ад ацёкаў.

5 грамаў марской солі задавольваюць сутачную патрэбу арганізма ў ёдзе. Гэта неабходны элемент для нармальнай работы шчытападобнай залозы, якая адказвае за абмен рэчываў, рэгулюе функцыі сардэчна-сасудзістай і нервовай сістэм.

Селен — мікраэлемент, які абараняе нашы клеткі ад свабодных радыкалаў, што выклікаюць рак і скарачаюць працягласць нашага жыцця.

Сучаснае высокапрадукцыйнае абсталяванне плюс добрасумленная праца калектыву — вось з чаго складаецца поспех прадпрыемства. Зразумела, яшчэ трэба ўзгадаць пра ўнікальную рэцэптуру вырабаў і высокую якасць зыходных прадуктаў.

УНП 590911128

НАПОЙ, ЗНАЁМЫ З ДЗЯЦІНСТВА

Дырэктар прадпрыемства Андрэй ГАРЦУЕЎ.

Што рабіць, калі па той ці іншай прычыне ўрачы не рэкамендуюць вам піць натуральную каву? Цалкам адмовіцца ад любімага напою? Неабавязкова. Ашмянскі вытворца прапаноўвае выдатную альтэрнатыву каве — нераспушчальныя кававыя напоі.

«ЯЧМЕННЫ» — ЦЯПЕР З МЕЛІСАЙ, ЦЫКОРЫЕМ І ІМБІРОМ

Упершыню давялося пабачыць, як зялёныя кававыя зярняткі ператвараюцца ў звыклыя карычневыя, што набываю для сваёй кавамолкі ў крамах, у Ашмянах, падчас экскурсіі па ААТ «БелКава». Праўда, як высветлілася, нягледзячы на назву прадпрыемства, кава — далёка не асноўная яго прадукцыя.

— Мы выпускаем прыблізна 2–3 тоны кавы за месяц, — распавядае **дырэктар ААТ «БелКава» Андрэй ГАРЦУЕЎ.** — Зялёнае зерне прывозім з краін Лацінскай Амерыкі, Індыі і Афрыкі. Затым строга вытрымліваем тэхналогіі яго абсмажвання і пакавання. Гэта дазваляе стварыць і захаваць непаўторны смак і водар кавы.

Прадаецца натуральная нераспушчальная кава беларускай вытворчасці як у зерні, так і ў молатым выглядзе. На прылаўках у крамах шукайце яе пад назвамі «Медыум», «Класік» і «Прэміум». Ашмянская кава, паводле слоў тэхнолага «БелКавы», ідэальная для заварвання ў хатніх умовах, бо мае вельмі дробны памол.

Для тых жа, каму кафеін супрацьпаказаны, ААТ «БелКава» выпускае нераспушчальныя кававыя напоі на аснове ячменю, жыта і аўса. Яны складаюць 70% ад агульнага аб'ёму вытворчасці прадпрыемства.

— Забяспечваем імі не толькі беларускія школы, дзіцячыя сады, бальніцы, але і сацыяльныя ўстановы Расійскай Фэдэрацыі, — удакладняе Андрэй Іванавіч. — У прыватнасці, нераспушчальны кававы напой «Ячменна-аматарскі вітамінізаваны» мы зрабілі спецыяльна па просьбе расійскага боку. Ён прызначаны непасрэдна для дзіцячага школьнага харчавання. У састаў навінкі ўваходзіць комплекс з 10 відаў вітамінаў, напрыклад, толькі вітаміну В — шэсць відаў. Таму карысць напою для арганізма неаспрэчная. Пра гэта сведчыць і тое, што Міністэрства аховы Рэспублікі Беларусь дазволіла спажываць гэты напой дзецям з трох гадоў. Акрамя таго, што гэты прадукт карысны для дзіцячага арганізма, ён можа і для дарослых замяніць каву, калі яе па нейкіх прычынах ужываць няма магчымасці.

Ашмянскія кававыя напоі праверaны часам: вырабляюць іх на прадпрыемстве ўжо больш за 40 гадоў. Яны вылучаюцца не толькі сваім непаўторным смакам, але і карысныя для здароўя.

— «Восеньскі», «Залаты колас», «Бурштынавы», «Прамяністы», «Сюрпрыз», «Народны», «Раніца», «Ячменна-аматарскі» — усе нашы нераспушчальныя кававыя напоі змяшчаюць незаменныя амінакіслоты, здольныя аднавіць сутачны рацыён чалавека, і комплекс вітамінаў, такіх неабходных здароўю кожнага з нас, — адзначае **начальнік вытворчай лабараторыі ААТ «БелКава» Ларыса ФАРМАГА.** — Ды і наогул, свежаабсмажанае збожжа, лічаць вучоныя, дабратворна ўплывае на імунную сістэму, функцыі печані, ціск крыві.

Кожны напой створаны па арыгінальнай рэцэптуры з улікам пажаданняў пакупнікоў. Таму сярод 13 найменняў вы абавязкова знойдзеце свой — той, што прыйдзецца найбольш даспадобы менавіта вам.

— Найбольшым попытам у дзяцей і пажылых людзей, якім супрацьпаказана ўжыванне кавы, карыстаюцца напоі на аснове ячменю, жыта, аўса без кафеіну, — кажа Ларыса Фармага. — Яшчэ 4 групы кававых напояў, якія мы выпускаем, маюць у сваім саставе ад 15 да 30% кафеіну. Яны будуць да душы тым людзям, якія любяць прысмак кавы, яе гарчынку. Параўнальна нядаўна распрацавалі новую інавацыйную групу нераспушчальных кававых напояў для сапраўдных гурманаў — з дабаўленнем цыкорыю, імбіру, мелісы.

— А як правільна заварваць кававы напой, выраблены ў Ашмянах? — пацікавіліся мы ў Ларысы Фармагі.

— Напой трэба засыпаць у гарачую ваду, давесці да кіпення і даць адстаяцца. У выніку правільнага прыгатавання напою захоўваюцца ўсе карысныя і пажыўныя ўласцівасці збожжавых культур, якія змяшчаюць амінакіслоты, а таксама макра- і мікраэлементы, глюкозу, фруктозу. Многія любяць у турцы заварваць. Можна дадаць вяршкі, малако і цукар на смак. Прынамсі, так рабілі, калі я яшчэ хадзіла ў школу. Гэта ж напой знаёмы з дзяцінства не аднаму пакаленню.

Варта адзначыць, што ашмянскія натуральныя кававыя напоі не маюць супрацьпаказанняў: наадварот, рэкамендуюцца людзям усіх узростаў. А напоі без кафеіну дык наогул можна даваць дзецям з трох гадоў. Абмежаванняў па колькасці выпітага напою і часу сутак таксама няма.

Машыніст упаковачных аўтаматаў Леакадзія ЯХІМОВІЧ і яе «плантацыя» кавы.

ПАКАШТУЙЦЕ, НЕ ПАШКАДУЕЦЕ!

ДУХМЯНЫ З ЦЫКОРЫЕМ

Напой выраблены з натуральнай сыравіны: абсмажанага ячменю і гаючага «залатога кораню» — цыкорыю. Цыкорый павышае апетыт, паляпшае страваванне, супакойвае нервовую сістэму і мае яшчэ шэраг іншых карысных і лекавых уласцівасцяў. Так што напоі з цыкорыем — гэта не толькі смачна, але і карысна!

МЕЛІСАВЫ

Вельмі ўдалым аказалася спалучэнне ячменю з мелісай. Духмяна-асвяжальныя ноткі мелісы, несумненна, узбагачаюць смак ячменнага напою. Больш за тое, эфірны алей, які ёсць у мелісе, валодае супакойвальным эфектам, таму мелісу выкарыстоўваюць пры лячэнні неўрозаў, бяссонніцы, пры сардэчных захворваннях.

ДУХМЯНЫ З ІМБІРОМ

Імбір — унікальны сродак, які дапамагае змагацца з рознымі прастуднымі захворваннямі. Кававому напою імбір надае прыемны асвяжальна-мятны прысмак. Дарэчы, гэты напой бадзёрыць значна лепш, чым кава.

Начальнік вытворчай лабараторыі Ларыса ФАРМАГА дэманструе прадукцыю роднага прадпрыемства.

ЯКІЯ ДРАНІКІ БЕЗ АШМЯНСКАЙ ПРЫПРАВЫ?!

Акрамя кававага напою і кавы, ААТ «БелКава» прапаноўвае сваім пакупнікам жэлацін, жэле, лімонную кіслату, кісялі, ванільны цукар і, вядома ж, духмяныя прыправы і спецыі, якія дазваляюць узбагаціць смак любой стравы.

— Вырабляем каля 44 відаў прыпраў і спецый, — кажа Андрэй Гарцуеў. — Вялікім попытам карыстаюцца прыправы «Для беларускіх дранікаў» і «Для беларускай мачанкі» — гэта наша ўнікальная распрацоўка. Такой прыправы вы дакладна нідзе не знойдзеце! Не так даўно распрацавалі тры новыя віды прапраў: «Універсальная», «Булён» і «Юшка». Расфасавалі іх у пакецікі па 150 грам. Новыя прыправы вылучаюцца ўдалым спалучэннем цаны і якасці, таму нядзіўна, што першая партыя разышлася імгненна.

Вельмі радуе, што ў саставе ашмянскіх прыпраў, у адрозненне ад імпартных, няма шкодных харчовых дабавак.

— Адметная асаблівасць і галоўны прынцып у рабоце нашага прадпрыемства — толькі натуральная прадукцыя, без прымянення араматызатараў, — адзначае Андрэй Гарцуеў. — Бо для кожнага са спажыўцоў найважнейшымі крытэрыямі з'яўляюцца перш за ўсё якасць і бяспека для здароўя.

— Пра шкоду харчовых дабавак, узмацняльнікаў смаку вельмі шмат інфармацыі ў інтэрнэце, па тэлебачанні, у газетах, — дадае Ларыса Фармага. — Людзі ў гэтым навучыліся разбірацца. Ад нас, вытворцаў, парабуюць выносіць на этыкетку ўсе інгрэдыенты, што ўваходзяць у састаў прадукцыі. І гэта, лічу, правільна. Калі чалавек клапоціцца пра сваё здароўе, яму не ўсё роўна, што ён дадае ў ежу пры прыгатаванні: ён пачытае і зробіць свой выбар. Мы арыентуемся менавіта на такога, свядомага, пакупніка.

Варта адзначыць, што на прадпрыемстве ёсць уласная лабараторыя, дзе высокакваліфікаваныя спецыялісты праводзяць строгі пастаянны кантроль якасці сыравіны і гатовай прадукцыі. Калі ж казаць пра ўдасканаленне, у тым ліку і пра мадэрнізацыю вытворчасці — гэты працэс у ААТ «БелКава» ідзе няспынна.

— Сёння перад намі стаіць задача зрабіць падачу нашай якаснай прадукцыі прыгожай за кошт новай упакоўкі, — кажа Андрэй Іванавіч. — Бо сёння, калі на рынку вельмі вялікая колькасць прапаноў, спажывец сустракае тавар, як той казаў, па вопратцы... Вось ужо запусцілі ў гандлёвую сетку новую лінейку прадукцыі ва ўпакоўцы «доепак». Чакаем пастаўку слоічкаў-млыноў, у якія думаем расфасоўваць каля шасці відаў перцаў. Сёння наша прыправа разлічана на людзей з сярэднім і высокім узроўнем даходу. У бліжэйшы час пачнём выпускаць спецыі і прыправы эканом-класа. Такім чынам наша якасная прыправа стане даступнай кожнаму. Кошт зменшым выключна дзякуючы больш танной упакоўцы, на якасць прадукцыі, хацеў бы падкрэсліць, гэта ніяк не паўплывае.

УНН 500057141.

Аператар Вячаслаў ТРЭЙМАК і начальнік вытворчага ўчастка Таццяна ГЕЛАЙ каля абсталявання для абсмажвання кавы.

Матэрыялы спецвыпуску падрыхтавалі Надзея ДРЫЛА, Валер'ян ШКЛЕННІК, Алена ДАЎЖАНОК, фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Ігуменскі тракт

№ 19 (77)

ПАКЛОННЫ КРЫЖ — НА МЕСЦЫ ФАРЫ ВІТАЎТА

У Гродне, на месцы знакамітага храма Фара Вітаўта, узарванага ў 1960-я гады, усталяваны памятны знак. Яго разам асвячалі біскупы праваслаўнай і каталіцкай епархій.

Гэты помнік (ці, як яго называюць, Паклонны крыж) уяўляе сабой скульптурную кампазіцыю ў выглядзе паўразбуранай аркі з памятным надпісам. Аўтарамі работы з'яўляюцца гродзенцы — скульптар Сяргей Більдзюк і архітэктар Аляксандр Захарчук.

Храм Фара Вітаўта ўзарвалі 29 лістапада 1961 года. Гэта быў самы вялікі храм Гродна, сёлета ён мог бы адсвяткаваць сваё 625-годдзе. Пабудавалі яго па распараджэнні князя Вітаўта ў 1389 г. спачатку як драўляны, а пры Стэфану Баторыю (у XVI ст.) ён стаў каменным.

Першы намеснік старшыні Гродзенскага гарвыканкама Барыс ФЁДАРАЎ на цырымоніі адкрыцця памятнага знака сказаў:

— Што было разбурана, таго ўжо не вярнуць, але галоўную святыню Гродна ні ў якім разе нельга забываць. Вядома, пры абмеркаванні праекта помніка было зламана нямала коп'яў. Але галоўнае нават не тое, як мог бы і павінен выглядаць гэты памятны знак, а тое, каб ён стаў сімвалам узаемнай павагі да перакананняў розных канфесій, імкнення захаваць памяць пра наша агульнае мінулае.

Біскуп Гродзенскай каталіцкай епархіі Аляксандар КАШКЕВІЧ адзначыў, што памятны знак — гэта своеасаблівы сімвал вечнасці. А само месца, на якім яшчэ нядаўна ўзвышаўся велічны храм, з'яўляецца святым. Таму і сквер, у якім усталяваны помнік,— напамін пра хрысціянскія карані і мінулыя пакаленні Гродна. Тут на працягу стагоддзяў праводзіліся набажэнствы і засяроджвалася жыццё першай у Гродне каталіцкай парафіі.

Праваслаўны епіскап Гродзенскі і Ваўкавыскі Праасвяшчэнны Арцемій падкрэсліў, што невыпадкова асвячэнне памятнага знака адбывалася напярэдадні дня Святой Троіцы:

— Мы часта даём знешнюю ацэнку нейкіх падзей, якія мелі месца ў мінулым, але ўсё мае свае глыбокія духоўныя прычыны, у тым ліку і разбурэнне гэтага храма. Калі народ губляе веру, ён сам сябе знішчае. Дык няхай Паклонны крыж стане знакам нашага пакаяння за цёмныя плямы, якія мелі месца ў нашай гісторыі. А пакаянне — заўсёды адраджэнне, урачыстасць жыцця. Няхай гэтая падзея будзе таксама знакам нашага імкнення да адзінства, да таго, каб на нашай зямлі ніколі не было міжканфесійных, міжрэлігійных, міжнацыянальных канфліктаў.

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.

■ Год гасціннасці

Сярэднявечча каля сцен Сафійскага сабора

Пяты фестываль сярэднявечнай культуры «Рубон» адбыўся ў старажытным Полацку

У фэсце, які арганізавалі пры падтрымцы Еўрапейскага саюза, акрамя беларусаў, бралі ўдзел прадстаўнікі Расіі, Эстоніі, Латвіі, Літвы. Арганізатары пастараліся зрабіць юбілейны «Рубон» самым яскравым, разнастайным на падзеі і сюрпрызы.

У прыватнасці, упершыню правялі міжнародны кулінарны фестываль з дэгустацыяй. На свае вочы можна было не толькі ўбачыць, як прадстаўнікі розных краін гатуюць сярэднявечныя стравы, але і пачаставацца.

Навінкай стаў і штурм замка (мерапрыемства ў рамках праекта трансгранічнага супрацоўніцтва Латвія — Літва — Беларусь «Музейныя вароты»). Відовішча ўражвала: гледачы ўбачылі тое, што паказваюць у фільмах пра рыцараў. Апошнія падчас бітвы ваявалі зусім не на жарт: ад сечы зброя ў некаторых ламалася. Што дзіўна, сярод лучнікаў і нават рыцараў былі і дзяўчаты.

Наогул, члены клубаў гістарычнай рэканструкцыі былі падчас трох фестывальных дзён у цэнтры ўвагі. Баі ваяроў, прадстаўнікоў розных эпох сярэднявечча, турнір лучнікаў, тэатралізаваны канцэрты сярэднявечнай музыкі, захапляльныя майстар-класы па рамёствах і па сярэднявечных танцах, тэатралізаваныя мініяцюры — гэтыя і іншыя падзеі прыкоўвалі ўвагу сотняў гараджан і гасцей горада.

І па-за межамі рыцарскіх баёў было шмат чаго цікавага. У прыватнасці, у першы дзень фэсту іскрынкай стала прэзентацыя горада «Полацк сучасны і старажытны» ў выглядзе малюнкаў з… пяску.

У наша стагоддзе мабільнікаў, планшэтаў, электронных кніг на дзіцячай пляцоўцы фэсту дзеці і нават іх бацькі з задавальненнем гулялі ў гульні далёкіх продкаў. Можна было пахадзіць па вяроўках, пакатацца на каруселі даўніх часоў. Вялікі інтарэс, як ні дзіўна, выклікалі драўляныя цацкі. Зацікавіла і анімацыйная праграма «Мы — археолагі»…

Вялікія чэргі выстройваліся да крыніцы, што недалёка ад славутага Барысава каменя. Тутэйшыя расказваюць, што ў гарачыню тая вада — найлепшы сродак ад смагі, а яшчэ яна карысная для здароўя.

Застаецца дадаць, што цэны на ўваходныя квіткі былі вельмі дэмакратычныя: 30 тысяч рублёў — дарослы, 15 тысяч — дзіцячы.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Полацк.

Фотаздымкі Дзмітрыя ДЗЯМКО.

■ Шануй сваё!

«ТАКІХ КРАМ, ЯК НАША, У ЕЎРОПЕ Я НЕ БАЧЫЎ», або Народнае — значыць жывое

Калі не ведаеце дакладнага адраса, выпадкова трапіць у этнакраму «Рагна», што знаходзіцца ў беларускай сталіцы, не атрымаецца. Бо знаходзіцца яна ў адным з завулкаў, зусім не ў цэнтры. Аднак пакупнікі сюды прыходзяць: хтосьці — прачытаўшы ў інтэрнэце, кагосьці прыводзяць сябры, а іншыя — пабываўшы на адной з творчых імпрэз. Чым жа можа прывабіць «Рагна»?.. Да столі падвешаны шматлікія саламяныя павукі. На сценах вісяць вялізныя калядныя зоркі, таксама з саломы. Вось стаіць драўляная покуць, іначай бажніца, побач — іншыя драўляныя і гліняныя вырабы. Ёсць тут і абрусы, самаробныя свечкі, плеценыя з лазы, чароту кошыкі і падносы, упрыгажэнні, зробленыя з саломкі і кабачковых семак. Галоўны крытэрый выкладзеных тут рэчаў — усё зроблена сапраўднымі майстрамі, у адзіным экзэмпляры. Вядома ж, ёсць тут і больш дробныя, але таксама арыгінальныя сувеніры — драўляныя магніцікі-размалёўкі для дзяцей, мыла з водарамі беларускіх палёў і многае іншае.

Дырэктар этнакрамы Ігар Міхна расказаў карэспандэнту «Звязды», што, трапіўшы сюды можна ўбачыць (а дакладней пачуць) яшчэ адзін цуд: людзі неяк самі сабой пачынаюць размаўляць па-беларуску. Відаць, мова, традыцыі, прадметы са скарбніцы народнай культуры — усё гэта мае неразрыўную нябачную сувязь.

— Спадар Ігар, як з'явілася ідэя адкрыцця этнакрамы?

— Усё пачалося з таго, што я сам шукаў цікавыя падарункі за мяжу і бачыў, што ўсё даволі стандартнае. Складана было патрапіць на нешта арыгінальнае. Акрамя таго, я заўважыў, што на нашым рынку, як і на іншых, мешаніна: этнічныя тавары рознага паходжання знаходзяцца разам, асобна можна вылучыць хіба што ўсходнія сувеніры. А мне вельмі хацелася бачыць сваё, бо наша старадаўняя культура надзвычай багатая.

— Няўжо так мала этнічных беларускіх сувеніраў на нашым рынку?

— Часта даводзіцца бачыць проста прафанацыю. Напрыклад, арнамент выкарыстоўваецца без ведання традыцый — яго ролі, філасофіі, прыгажосці. Я бачыў, што ў пэўным праекце арнамент наносілі на ўнутраную частку каўняра (такога быць не магло, бо гэта адна з самых брудных частак адзення), а адзін дызайнер «упрыгожыў» арнаментам нават жаночую бялізну. У беларускай культуры ніколі не прысутнічалі мацюкі і адкрытыя сексуальныя інтэрпрэтацыі — усё было прыхавана і пададзена па-асабліваму. Было зразумела, пра што ідзе гутарка, аднак існавалі некаторыя табу на пэўныя спосабы падачы інфармацыі. Так і арнамент, які нанесены штучна,— гэта нелагічна. Таму ў нашага прадпрыемства паступова ўзнік дэвіз: «Рэчы, што маюць сэнс». Мы імкнёмся знайсці новыя формы для праяў традыцыйнай культуры. Я зразумеў, што няма сэнсу рабіць «кансервы» і займацца выключна рэканструкцыяй строяў XIX, XX стагоддзяў — таго, што зафіксавана на фота або захавалася ў выглядзе музейных экспанатаў. Да таго часу культура існавала тысячагоддзі, і часта невядома, у якім выглядзе. Таму важна вынайсці сучасную падачу традыцыйных для Беларусі з'яў.

Яна ЖАЎНЯРОНАК дэманструе завушніцы, зробленыя з саломкі і кабачковых семак.

У нашага прадпрыемства ўзнік дэвіз: «Рэчы, што маюць сэнс». Мы імкнёмся знайсці новыя формы для праяў традыцыйнай культуры.

— Падаецца, вы даволі глыбока ведаеце нацыянальную культуру. Гэта дзякуючы спецыяльнай адукацыі або вашы бацькі, бабулі і дзядулі перадалі вам такое разуменне спрадвечнага?

— Спецыяльнай адукацыі не маю, але маю інтарэс. Звычайна, калі чалавек цікавіцца нечым, то ён часта здабудзе ў гэтай сферы больш, чым мог бы хтосьці даць. А мне хацелася бачыць і ведаць сапраўдныя рэчы і іх сэнс. Часам я вельмі здзіўляюся, што некаторыя сучасныя словы, якія мы цяпер ужываем, маюць зусім іншае значэнне, якое вынікае з іх паходжання. Напрыклад, «стымул» азначае палку, якой паганялі раба. Цікава, што мы цяпер карыстаемся ім, не задумваючыся, а першапачаткова яго сэнс быў зусім іншым. Тое ж і з культурай: выкарыстоўваць яе праявы трэба да месца. Мяне з дзяцінства цікавілі вікінгі, Поўнач, я шмат чытаў пра іх. І мне, безумоўна, стала цікава: а што было ў маіх продкаў?.. Ужо цяпер згадваю, як жыла мая бабуля, калі мы прыязджалі да яе на вёску, як і чым яна нас карміла,— і я бачыў, што яна ўсё ведае. Прычым перадавалася гэта натуральным шляхам, без спецыяльных прыстасаванняў і адукацыі. Таму насамрэч нічога шукаць не трэба: можна проста ўзгадаць, як рабіла штосьці бабуля. Жыццё па раскладзе, здаровае харчаванне — усё гэта было ў нашых продкаў. Памятаю, у 5–6 гадоў я трапіў на вяселле, дзе бабулі галасілі (цяпер гэта называецца аўтэнтычны спеў), я стаяў проста агаломшаны. Яшчэ вельмі ўразіла тое, што сястра, старэйшая на некалькі гадоў, падпявала ім. Гэта быў ці не апошні для мяне прыклад аўтэнтычнай перадачы культуры.

— Відаць, усяго гэтага народнага вам не хапае ў сучасным жыцці?

— Мы цяпер кажам «народны», а насамрэч гэта проста лад жыцця нашых продкаў на працягу тысячагоддзяў. Многія прадметы функцыянальна не патрэбны, бо надышла эпоха інфармацыі. Аднак хацелася б, каб у сённяшнім свеце назапашаны вопыт продкаў выліваўся ў сучасныя «хайтэкаўскія» рэчы. Пакуль гэта толькі мары, аднак, калі яны ёсць у галаве, значыць, калі-небудзь рэалізуюцца. «Народнае» — гэта пэўная агульнапрынятая класіфікацыя — а насамрэч яно «жывое, нашае». Калі мы не адмаўляемся ад гэтага на карысць, умоўна кажучы, «Тома і Джэры», то самі з'яўляемся яго носьбітамі.

— Давайце пагаворым пра практычны бок вашай справы. Наколькі цяжка было адкрыць этнакраму?

— У арганізацыйным плане гэта не цяжка. Больш складанай была канцэпцыя, бо мы прадаём не тавары, а ідэю. Хоць памяшканне размяшчаецца не ў цэнтры горада, да нас часта прыходзяць людзі, сюды прыводзяць замежнікаў. Многія задаюць пытанні, іншым падабаецца нават проста паглядзець. Канцэпцыя крамы павінна была выспець у маёй галаве, а аднойчы я зразумеў, што надышоў час зрабіць гэта, бо пасля магу страціць нешта важнае.

Фотаздымкі Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Самаробныя паясы.

— Наколькі я ведаю, гэтая справа для вас пакуль затратная і даводзіцца ўкладаць уласныя сродкі, каб крама жыла?

— Пакуль што так, крама недазарабляе, таму разам з братамі мы падтрымліваем яе дзейнасць. Часам дапамагаюць сябры, іншыя мецэнаты. Наш арэндадаўца лічыць, што такая крама павінна быць у горадзе, таму таксама спрыяе нашай справе. Спадзяёмся, што з часам мы выйдзем у нуль і ў плюс *(усміхаецца)*.

— Значыць, вы працуеце кімсьці яшчэ, акрамя дырэктара крамы, каб зарабляць грошы?

— Я арганізую вандроўкі па цікавых гістарычных і прыродных мясцінах, супрацоўнічаю з турфірмай. Вязу людзей па нестандартных маршрутах — туды, куды звычайныя аўтобусы не дабіраюцца. А людзям часта цікава паглядзець на сапраўднае жыццё, а не прайсціся па цэнтральнай вуліцы і завітаць у галоўныя музеі. Напрыклад, у Германіі ёсць востраў, а на ім музей прыроды. Тры паверхі яго знаходзяцца пад зямлёй. Аказваючыся там, трапляеш у вялізны пясочны гадзіннік-ліфт, паўсюль чуеш гукі прыроды. Не кожны можа трапіць на гэты востраў — возьмем людзей у такія, схаваныя на першы погляд месцы, я і атрымліваю прыбытак.

— Пэўна, нагледзеўшыся на замежныя дзівосы, вы адчуваеце яшчэ большае жаданне паказваць сваё, адметнае?

— Шчыра кажучы, у іх цікавыя музеі. А вось што тычыцца крам — усё падпарадкавана грашам, кліенту і вытворцу, якому прасцей зрабіць усё масава, на пэўным заводзе. Рэчы з розных гарадоў хоць і маюць розную сімволіку, але фактычна аднолькавыя. Такіх крам, як наша, у Еўропе я не бачыў. Мяркую, адна з прычын — гэта тое, што не так шмат майстроў, якія з такім падыходам (унікальнасці кожнай рэчы) стваралі б свае вырабы. А ў нас шмат эксклюзіву: калі мы штосьці рэалізавалі, то, пакуль майстар не зробіць, гэтага няма.

— Вы не толькі гандлюеце, але часта праводзіце і розныя імпрэзы. Што яны сабой уяўляюць?

— На Дзяды мы шылі торбы, а ў падарунак тым, хто іх атрымліваў, клалі хлеб, выпечаны па старадаўніх тэхналогіях. На Каляды мы таксама стваралі торбы і ў нас праводзіліся майстар-класы па вырабе пернікаў. Мы імкнёмся, каб былі рэчы з натуральных матэрыялаў, максімальна функцыянальныя, ужытковыя, сувенірныя, але ў той жа час стараемся штосьці прыстасоўваць да пэўных свят, прычым вынаходзім такія формы, каб захавалася сутнасць. Да таго ж шукаем тое, што было б дарэчы ў горадзе, бо мы цяпер усё ж гарадская нацыя.

— Вы маеце добрую канцэпцыю, ідэі. А ці бачыце ўжо пэўны плён сваёй працы?

— Так, я бачу яго кожны дзень. Калі людзі прыходзяць, усміхаюцца — то і ты вяртаешся дадому ў добрым настроі. Мая маці кажа: «Добра думай — добра будзе». У кепскім настроі ты можаш усё парушыць, а ў добрым, наадварот, заўважаеш новыя магчымасці — бачыш неба, зялёнае лісце. Я часам люблю казаць, што тысячы долараў у труне мне будуць не патрэбны. На тым свеце, умоўна кажучы, 100 беларускіх рублёў мне хопіць. Таму той настрой і сэнс, якія нясуць нашы рэчы, мне падаецца вельмі важным — гэта той вынік, да якога сапраўды варта імкнуцца.

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ

БАЙКІ кухмістра ВЕРАШЧАКІ

САПЯЖАНКА — арыстакратка сярод груш

Бадай, ніякі іншы гатунак грушы так часта і з такім глыбокім сэнсам не згадваўся ў беларускай і польскай літаратуры, як сапяжанка — своеасаблівы сімвал старасвецкай саліднасці, даўгавечнасці, хатняй утульнасці. Як, напрыклад, у аповесці «Над Нёманам» Элізы Ажэшкі: «Стагадовая, мабыць, сапяжанка, сваё галлё, ужо бясплоднае, але густа пакрытае лісцем, паклала на вокны і сцены дома, чые пабеленыя аканіцы і нарожнікі весела з-за яе выглядалі». Не раз сапяжанку настальгічна згадваў у сваіх творах нобелеўскі лаўрэат Чэслаў Мілаш. А адзін з ранніх гумарыстычных вершаў Якуба Коласа, «нашаніўскай» пары, называўся «Грушы-сапяжанкі». Гэта рэальная гісторыя з дзяцінства Кастуся Міцкевіча, з наднёманскай сядзібы Ласток, пра тое, як дзеці спрабавалі ашукаць дзядзьку Петруся, крадучы яго грушы.

Сапяжанку часам называлі «арыстакраткай сярод груш». Магчыма, за тую даўгавечнасць, якой яна вылучаецца сярод іншых нашых гатункаў, ці за далікатнасць: яе сакавітыя, вінна-салодкія, трохі ржавага колеру, вельмі смачныя, але мяккія плады дрэнна пераносяць транспарціроўку. Да таго ж сапяжанкі даволі дробныя. Таму гэты гатунак, хаця і вельмі папулярны ў нас у свой час, не вельмі падыходзіць да камерцыйнага садоўніцтва. Хутчэй, для хатняга спажывання. Акрамя таго, сапяжанка досыць хваравітая, як і належыць арыстакратцы: ураджай лёгка страціць праз паршу. Іншы эпітэт, што падыдзе да гэтага гатунку — «польскі бергамот». Бергамотамі называюць групу гатункаў грушы, якія маюць прыплясканую форму, і гэтае слова — bergamotto — мае турэцкія карані (beg «князь», armud «груша»). Карацей, сапяжанка — «княжацкая груша».

З'яўленне гэтага гатунку ў Беларусі і ва ўсёй Рэчы Паспалітай звязваюць з імем самага ўплывовага ў свой час магната ў ВКЛ — ваяводы віленскага, гетмана вялікага літоўскага і ўладальніка многіх іншых тытулаў і пасадаў, Казіміра Яна Сапегі (1637–1720). У канцы XVII стагоддзя род Сапегаў, які ён узначальваў, засяродзіў у сваіх руках усе асноўныя кіруючыя пасады ў Вялікім Княстве Літоўскім, і распараджаўся ўладай і дзяржаўнай маёмасцю выключна на сваю карысць. У рэшце рэшт гэта прывяло да грамадзянскай вайны, якая цягнулася некалькі гадоў, пакуль кааліцыя астатніх уплывовых магнацкіх родаў у 1700 годзе не нанесла Сапегам і іх прыхільнікам паражэнне. Той перыяд панавання Сапегаў увайшоў у гісторыю як час неўтаймаванага эгаізму і хцівасці. Але, на дзіва, выгадаваны пад патранажам Казіміра Сапегі гатунак груш застаўся ў спадчыну нам усім, звязаўшы сваёй сімволікай шмат пакаленняў.

Сёння сапяжанкі досыць шырока распаўсюджаны на прасторах Еўразіі. Напрыклад, шмат іх расце ў Кіргізіі — у Чуйскай даліне і Ісык-Кульскай катлавіне. Ці не ссыльныя паўстанцы іх туды завезлі ў XIX стагоддзі?.. Паводле адной з версій, месцам, адкуль сапяжанкі распаўсюдзіліся па ўсёй былой Рэчы Паспалітай і ў цэлым свеце, быў мінскі палац Сапегаў, які да налётаў гітлераўскай авіяцыі ў чэрвені 1941 года стаяў на былой вуліцы Юраўскай — на месцы сённяшняга Палаца Рэспублікі. Гэты дом, які ў свой час лічыўся лепшай рэзідэнцыяй у горадзе (тут у 1706 годзе месяц пражыў рускі цар Пётр I), быў акружаны прыгожым фруктовым садам, у якім флянсы будучай сапяжанкі быццам бы пасадзілі дочкі Казіміра Яна Сапегі, вывезшы іх з Францыі. А Казімір Сапега быў на той час яшчэ і мінскім кашталянам. Праўда, з генеалогій вядомая толькі адна дачка мажнаўладцы — Кацярына-Схаластыка.

Адносна месца нараджэння славутага гатунку ёсць іншыя версіі. Паводле Паўла Шпілеўскага, грушы-сапяжанкі некалі вывез з Венгрыі сам Казімір Сапега і спачатку разводзіў іх у сваёй рэзідэнцыі Беразіно. А беларускі паэт Аляксей Зарыцкі прысвяціў паходжанню сапяжанак аднайменны верш, у якім выклаў сваю версію, больш паэтычную, чым гістарычную, звязваючы пачатак сапяжанак са слаўным і грозным некалі Быхаўскім замкам. Зрэшты, паколькі Казімір Сапега сапраўды быў яшчэ і «графам на Быхаве», нельга адкідаць гэтую версію. І, вядома, у якой са шматлікіх яго рэзідэнцый ні былі б першапачаткова выведзены сапяжанкі, відавочна, што менавіта з падворкаў гэтага роду пачалося іх распаўсюджванне…

САПЯЖАНКІ

(Аляксей Зарыцкі)

Знаў напады,
Знаў набегі,
Чуў асады грук і гром
Замак гетмана Сапегі,
Змрочны замак над Дняпром.
І гарматы з грознай пыхай
Углядаліся ў прастор,
Пазіраючы на Быхаў,
На Дняпро й зарэчны бор.
Ды запомніўся народу
Гэты гетман тым здавён,
Што, вярнуўшыся з паходу,
Бавіў час у садзе ён.
Без шабелькі і пістолі
Завіхаўся ратны муж
На садоўніцкім прыволлі,
Каля яблынек ды груш.
Дзе батальныя прыгоды,
Клікі ў гонар перамог?
Пазабыліся паходы,
Грозны замак друзам лёг.
Спрахлі слугі і служанкі,
І штандар Сапегаў спрах,
Толькі грушы-сапяжанкі
Сёння спеюць у садах.
Летні вецер лёгка вее,
Навявае забыццё,
Ды панадна ружавее
Сапяжанка скрозь лісцё.

З'ЕЗДЗІЦЬ У РЫА І... ЗАСТАЦЦА Ў ЖЫВЫХ

FIFA WORLD CUP Brasil

ЯК БРАЗІЛЬСКІЯ ЎЛАДЫ ЗМАГАЮЦЦА ЗА БЯСПЕКУ ГАСЦЕЙ ЧЭМПІЯНАТУ СВЕТУ ПА ФУТБОЛЕ

З часоў, калі Ільф і Пятроў прыдумалі свайму герою блакітную мару ў выглядзе далёкай і экзатычнай Бразіліі, мінула шмат гадоў. Не, з гэтай краінай па-ранейшаму асацыююцца шырокія пляжы, загарэлыя людзі ў белым адзенні, карнавалы і мыльныя оперы… Але ўжо ў меншай ступені. Цяпер Бразілія перш за ўсё вядома як адно з самых небяспечных месцаў у свеце з вялікім узроўнем злачыннасці. І калі б Чукоўскі ў нашыя дні пісаў казку пра Бармалея, то пужаў бы дзяцей зусім не Афрыкай, а менавіта краінай, дзе многа-многа дзікіх малпаў.

Паліцыя і армія напагатове!

За апошнія 25 гадоў узровень злачыннасці ў Рыа-дэ-Жанэйра быў ацэнены як крытычны. Толькі за апошні год значна пачасціліся выпадкі крадзяжоў сотавых тэлефонаў, рабаванняў у аўтобусах і крамах, а па колькасці забойстваў — 50 тыс. у год — Бразіліі ўвогуле няма роўных на планеце. Вядома, бразільскія ўлады не сядзяць склаўшы рукі, а рыхтуюцца да Кубка свету… разам са злачынцамі, анархістамі і радыкаламі, якія, можна не сумнявацца, паспрабуюць сапсаваць футбольнае свята. Бяспеку ўдзельнікаў і гасцей турніру на стадыёнах і вуліцах дванаццаці гарадоў будуць забяспечваць каля 70 тыс. супрацоўнікаў паліцыі. Усяго ж армія супрацоўнікаў праваахоўных органаў на чэмпіянаце свету складзе 170 тыс. чалавек. З іх 20 тыс. — гэта сцюарды, якія прайшлі спецыяльныя курсы. Акрамя гэтага, для абароны замежных гасцей, якія прыедуць падтрымаць свае каманды, створана спецыяльнае ўпраўленне паліцыі колькасцю 10 тыс. чалавек. У гэтае элітнае падраздзяленне набіраюць лепшых прадстаўнікоў усіх сілавых структур.

На паперы ўсё выглядае грунтоўна, але сітуацыю ўскладняе незадаволенасць саміх паліцэйскіх сваім матэрыяльным становішчам і сацыяльнай абароненасцю. І праваахоўнікаў можна зразумець. Так, летась у Сан-Паўлу загінула больш за 100 паліцэйскіх. Гэта была помста найбуйнейшага бразільскага наркакартэля, які, па сутнасці, кантралюе горад, за парушэнне нефармальнага пагадненя аб перамір'і. І калі ахоўнікі парадку правядуць агульнанацыянальную забастоўку падчас чэмпіянату свету, як і абяцалі, гэта можа абярнуцца катастрофай.

Нефутбольныя праблемы футбольнай Бразіліі

Аднак арганізаваная злачыннасць — не адзіны галаўны боль бразільскіх улад. Нават за два тыдні да старту чэмпіянату свету Бразілію скалынялі шматтысячныя акцыі пратэсту. Парадокс, але краіна, для якой футбол — другая рэлігія, стала і застаецца дагэтуль праціўніцай галоўнай футбольнай падзеі чатырохгоддзя. Прычына абурэння бразільцаў відавочная: краіна аказалася не гатовай да таго, што чэмпіянат ёй абыдзецца так дорага. Паводле папярэдніх падлікаў, дзяржава выдаткавала на арганізацыю турніру амаль $4 млд. Ільвіная доля пайшла на будаўніцтва стадыёнаў. Тры — пабудавалі з нуля, а на васьмі арэнах прыйшлося рабіць поўную рэканструкцыю, што яшчэ даражэй, чым узводзіць з нуля. Некалі лепшы футбаліст свету, а цяпер палітык Рамарыа звярнуў увагу на тое, што за грошы, выдаткаваныя на будаўніцтва раскошнага Нацыянальнага стадыёна ў сталіцы, можна было пабудаваць 150 тыс. дамоў для маламаёмных, 8000 новых школ, 39 тыс. школьных аўтобусаў і 28 тысяч спартыўных пляцовак. Прычым гэтая арэна, як і дарагія стадыёны ў Манаусе і Куябе, пасля чэмпіянату рызыкуе застацца незапатрабаванай.

Гэта ўжо трэцяя хваля пратэстаў. Год таму на вуліцы бразільскіх гарадоў выйшла больш за мільён чалавек з надпісамі на плакатах «У нас няма транспарту, медыцыны і адукацыі, а вы купляеце нам чэмпіянат свету па футболе». Пазней пачаліся захопы адміністрацыйных будынкаў і сутычкі з паліцыяй. У адрозненне ад папярэдніх пікаў, цяперашнія акцыі аб'ядноўваюць не больш за 1000 чалавек, але, разам з тым, радыкальных настрояў і агрэсіі стала больш. На змену плакатам з лозунгамі і яркім перфомансам прыйшлі разбоі і падпалы, якія жорстка спыняюцца слёзатачывым газам і гумавымі кулямі.

Зразумела, што ўлады не дазволяць сарваць чэмпіянат. Цяперашні прэзідэнт Бразіліі Дылма Русеф — дама з жорсткім характарам, якой па сілах дабіцца перамір'я на час турніру, прычым на сваіх умовах. Прынамсі, на забеспячэнне парадку дзяржава патраціць $900 млн. А мясцовыя трушчобы, дзе і пражывае ўвесь крыміналітэт, будуць ачэплены войскамі аж да заканчэння фінальнага матча. Тым не менш на ўсялякі выпадак лепш запомніць карысныя парады ад Міжнароднай асацыяцыі спартыўнай прэсы. Лішнім гэта дакладна не будзе…

Дарына ЗАПОЛЬСКАЯ.

«РАЗУМНЫЯ КАНІКУЛЫ» АТРЫМАЛІ СТАРТ

У восьмы дзень школьных летніх канікулаў у «Зубраняці» стартавала рэспубліканская акцыя «Разумныя канікулы: адпачывай, загартоўвайся, працуй і развівайся»

УЖО другі год запар хлопчыкі і дзяўчынкі атрымліваюць унікальную магчымасць не банальнага адпачынку ў дзіцячых лагерах. Шмат займальнай інфармацыі, удзел у розных мерапрыемствах, знаёмства з цікавымі людзьмі — для дзяцей і падлеткаў падрыхтавана безліч пазнавальных і развіваючых праграм.

— Акцыя «Разумныя канікулы», ініцыятарам якой стаў нацыянальны дзіцячы адукацыйна-аздараўленчы лагер «Зубраня», зусім не азначае, што дзеці ўсё лета будуць толькі вучыцца. Нездарма слова «адпачывай» стаіць першым у слогане акцыі. Таму ў першую чаргу я жадаю добра адпачыць, атрымаць асалоду ад канікулаў і з добрым настроем вярнуцца ў школу для плённага новага навучальнага года, — з такім пажаданнем на ўрачыстым адкрыцці дзіцячага свята звярнуўся да хлопцаў і дзяўчынак намеснік міністра адукацыі Віктар Якжык.

Надзея БУЖАН. Фота аўтара.

ХАЛОДНЫ ДУШ ДЛЯ БЕЛАРУСКІХ ГАНДБАЛІСТАЎ

У тыднёвым спартыўным аглядзе «Звязда» распавядае пра фінал першага тура чэмпіянату Беларусі па футболе, пераход Андрэя Стася ў ЦСКА і доўгачаканае вяртанне на корт Вікторыі Азаранкі.

За 42 секунды да заканчэння матча чарнагорцы вырвалі перамогу ў падапечных Юрыя Шаўцова.

1. **Першы круг футбольнага чэмпіянату краіны** завяршыўся на нічэйнай хвалі. У чатырох матчах з шасці 11-га тура каманды не змаглі выявіць пераможцу. Прычым гульні БАТЭ-«Неман», «Гомель»-«Тарпеда-БелАЗ», «Дынама-Брэст»-«Шахцёр» скончыліся безгалявой нічыёй. А вось «Слуцк» і «Неман» разышліся з лікам 1:1.

Гарачым выдаўся паядынак паміж мінскім «Дынама» і наваполацкім «Нафтанам», якія займаюць другі і трэці радок у турнірнай табліцы адпаведна. Дзякуючы дублю Ненада Адамавіча «бела-сінія» вырвалі перамогу ў прынцыповага саперніка — 2:1. Пасля трохматчавай серыі паражэнняў, а таксама змены галоўнага трэнера (Андрэй Пышнік змяніў Андрэя Скарабагацьку. — **Аўт.**) футбалісты «Мінска» ў выдатным стылі перайгралі бабруйскую «Белшыну» — 3:0.

2. Крыўдным паражэннем для зборнай Беларусі скончыўся **першы матч накаўт-раўнда кваліфікацыі чэмпіяната свету-2015 па гандболе.** У гасцях падапечныя Юрыя Шаўцова мінімальна саступілі камандзе Чарнагорыі — 27:28. Падчас гульні беларусы вялі з розніцай у чатыры мячы, а за 42 секунды да фінальнай сірэны выйгравалі 27:26, але з-за памылак у контратаках прапусцілі два мячы ад чарнагорцаў. Пасля матча галоўны трэнер беларускай зборнай Юрый Шаўцоў пракаментаваў вынікі гульні: «Першы тайм мы вельмі добра правялі ў абароне, у варотах надзейна згуляў Віталь Чарапенька. Усяго дзесяць прапушчаных мячоў кажуць самі за сябе. Даволі разважліва дзейнічалі і ў нападзенні. А вось другую палову пачалі няўдала і дазволілі саперніку параўнаць лік. Прычына? Дрэнна згуляла абарона. Але некаторыя галы ў нашы вароты былі таксама і следствам нашых жа няўдалых дзеянняў у нападзенні». Матч у адказ зборныя правядуць 15 чэрвеня на «Мінск-Арэне».

3. Форвард хакейнага «Дынама-Мінск» **Андрэй Стась перайшоў у ЦСКА.** Прычым, паводле слоў генеральнага менеджара «зуброў» Уладзіміра Беражкова, па суме кампенсацыі гэты трансфер стаў рэкордным у гісторыі беларускага хакея. Нагадаем, у мінскім клубе Стась правёў 6 сезонаў, у яго актыве 294 матчы, у якіх ён набраў 87 ачкоў.

4. **Вікторыя Азаранка апусцілася на восьмы радок у рэйтынгу** Жаночай тэніснай асацыяцыі. Нагадаем, беларуская тэнісістка, якая з-за траўмы нагі не ўдзельнічае ў спаборніцтвах апошнія два з паловай месяцы, прапусціла «Ралан Гарос» і не змагла абараніць ачкі за мінулагодні паўфінал. У рэйтынгу Азаранка прапусціла наперад сёлетнюю пераможцу «Ралан Гарос» Марыю Шарапаву, якая цяпер замыкае пяцёрку лепшых тэнісістак планеты, а таксама чэшку Петру Квітаву і сербку Ялену Янкавіч.

Дарына ЗАПОЛЬСКАЯ.

НАРОДЖАНЫЯ 9 ЧЭРВЕНЯ

Яны адначасова могуць быць і ўпартымі ў дасягненні мэты, і на здзіўленне пасіўнымі. Што ж тычыцца іх ідэалаў, то тут яны непахісныя. Яны адкрытыя, вельмі шчырыя ў сваіх крытычных выказваннях. Вельмі патрабавальныя да дэталяў, могуць даходзіць да фанатызму, імкнучыся да таго, каб навакольныя былі з імі абсалютна згоднымі. Псіхалагічны трэнінг — вось ключ да поспеху, а фарміраванне цэльнасці характару для іх — залог поспеху ў жыцці і шчасця.

НАРОДЖАНЫЯ 10 ЧЭРВЕНЯ

Жыццё гэтых людзей складаецца з узлётаў і падзенняў. Яны валодаюць здольнасцю адчуваць як сумныя, так і радасныя бакі любых жыццёвых сітуацый. Як правіла, у іх надзвычай развітыя аналітычныя здольнасці — яны любяць эксперыментаваць, тэарэтызаваць. Жанчыны сваю энергію часцей за ўсё накіроўваюць на кантроль за навакольнымі абставінамі, дамагаючыся беззаганнага парадку як на рабочым месцы, так і дома, што з'яўляецца спробай перамагчы ўласную няўпэўненасць, якая жыве ў падсвядомасці.

ОАО «НАФТАН»

реализует на конкурсной основе
(с повышением начальной цены)
бывшее в употреблении неиспользуемое имущество:

Наименование конкурса (пометка на конверте)	Наименование	Инв. №	Год выпуска	Начальная цена с НДС, руб.РБ
1. Реализация неликвидов. Полуприцепы	Полуприцеп МАЗ 9758-012, гос. №9801ВА	13150621	2002	24 720 000
	Полуприцеп МАЗ 975800, гос. №А0779А-2	13151036	2004	30 720 000
	Полуприцеп МАЗ 9758 012, гос. №А0782А-2	13151032	2004	27 600 000
2. Реализация неликвидов. Маз.	Автомобиль МАЗ 54323-032, гос. №АВ5421-2	13151245	1995	48 000 000
3. Реализация неликвидов. Культиватор	Культиватор к минитрактору КТ-00200	15208972	2002	420 000
4. Реализация неликвидов. Бензоколонка	Бензоколонка /8994,722/ COM PRIMA/	6255970	2001	84 000 000
5. Реализация неликвидов. Трактор Т-25	Трактор Т-25, гос. № БЯ 9994	04150072	1994	37 800 000
6. Реализация неликвидов. Зил	Автомобиль ЗИЛ ММЗ554М, гос. №ВМ1182	13150251	1991	40 800 000

Состояние удовлетворительное.

Предложения принимаются по адресу: 211440, г. Новополоцк-1, ОАО «Нафтан», заводоуправление, каб. 101, до 9.30 по местному времени 10 июля 2014 года с пометками на конверте, указанными в таблице.

Извещения на проведение конкурса размещены на сайте www.naftan.by.

Контактные телефоны: 8 (0214) 59-87-83, 8 (0214) 59-89-26, 8 (0214) 59-88-42, (033) 398 08 48, (033) 398 07 67.

УНП 300042199

Полное наименование, местонахождение покупателя акций	Открытое акционерное общество «Приднепровье», Республика Беларусь, 247485, Гомельская область, г. Речица, ул. Строителей, 2а
Цель приобретения акций	На баланс открытого акционерного общества «Приднепровье» с целью аннулирования
Количество акций, которое намеревается приобрести покупатель	7 266 штук акций
Цена, по которой покупатель намерен приобрести акции	35 000 (тридцать пять тысяч) белорусских рублей за одну акцию
Форма, порядок и адрес оплаты акций	Денежными средствами в белорусских рублях безналичным перечислением на лицевой счет продавца либо почтовым переводом в течение 10 (десяти) календарных дней после зачисления приобретенных акций на счет «Депо» покупателя
Адрес, по которому будет совершаться покупка акций (заключаться договоры купли-продажи)	Открытое акционерное общество «Приднепровье» Республика Беларусь, 247485, Гомельская область, г. Речица, ул. Строителей, 2а
Дата начала срока представления предложений акционеров на продажу акций	11 июня 2014 г.
Дата окончания срока представления предложений акционеров на продажу акций	29 июля 2014 г.
Дата начала покупки акций (заключения договоров купли-продажи)	30 июля 2014 г.
Дата окончания покупки акций (заключения договоров купли-продажи)	30 августа 2014 г.

УНП 400315195

21 июня 2014 г. в 12.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Полесьежилстрой».

Повестка дня:

1. Об участии общества в других юридических лицах.

Местонахождение ОАО «Полесьежилстрой»: г. Брест, ул. Кижеватова, 60. Место проведения собрания: г. Брест, ул. Кижеватова, 60.

Время регистрации в день проведения собрания с 11.30 до 12.00.

При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера — доверенность).

С материалами собрания можно ознакомиться в рабочие дни, начиная с 13.06.2014 г. (с 14.00 до 16.00) по месту нахождения общества.

Совет директоров.

УНП 200050191

Даты | Падзеі | Людзі

1723 год — нарадзіўся Францішак Папроцкі, беларускі выдавец, перакладчык, доктар філасофіі (1758). Родам з Беларусі. Вучыўся ў Полацкім, Слуцкім, Нясвіжскім, Гродзенскім, Варшаўскім езуіцкіх калегіумах. У 1760 годзе ўзначаліў Віленскую акадэмічную друкарню, дзе ў 1760–1962 гг. выдаваў і рэдагаваў газету «Літоўскі веснік». Выдаў падручнік па геаграфіі «Еўропа, першая з частак свету апісаная», гістарычныя працы «Айчынныя звесткі пра Польшчу і ВКЛ» К. Галоўкі, «Найбольш значныя войны» і іншыя. Памёр пасля 1807 года.

1919 год — 95 гадоў таму нарадзіўся (вёска Хлеўна Кармянскага раёна) Авяр'ян Дзеружынскі, беларускі паэт. У 1941 годзе скончыў Камуністычны інстытут журналістыкі ў Мінску. У 1949–1984 гг. працаваў у выдавецтвах «Беларусь», «Мастацкая літаратура», «Юнацтва». Аўтар зборнікаў вершаў для дзяцей «Ляцелі дзве птушкі», «Яе завуць Каця», «Ластаўка», «Залаты каласок» і іншыя. Напісаў тэксты папулярных песень «Мінскі вальс», «Беларусь», «Мяцеліца». Памёр у 2002 годзе.

1936 год — у СССР на базе некалькіх творчых кінамайстэрань была створана кінастудыя «Саюзмультфільм» — наш адказ Уолту Дыснею. Трэба было стварыць свайго, савецкага Мікі Мауса. Першынцам савецкай мультыплікацыі сталі «Новыя прыгоды Гулівера», знятыя яшчэ за год да стварэння «Саюзмультфільма». Праз год пасля адкрыцця кінастудыі з'явіліся першыя каляровыя мультфільмы. Яшчэ праз 10 гадоў, у 1947-м, быў выпушчаны першы поўнаметражны маляваны фільм Іванова-Вано «Канёк-Гарбунок», а ў 1953 годзе было арганізавана аб'яднанне лялечных фільмаў. Доўгі час у гэтым аб'яднанні здымалі ў асноўным лялечныя спектаклі, але да канца 1950-х гадоў вытворчасць аб'ёмных фільмаў разгарнулася ўжо на высокім узроўні. У 1960–1970 гг. паўстала сузор'е фільмаў-серыялаў з пастаяннымі персанажамі: «Маўглі», «Малы і Карлсан», «Умка», «Ну, пачакай!», «Брэменскія музыканты», «Віні Пух», «Кракадзіл Гена» і іншыя.

Было сказана

Янка СІПАКОЎ, паэт:

«Варта ў крылы паверыць свае,
Трэба ў крылы свае паверыць,
А нам смеласці ўсё нестае,
Каб свой край на свой лёт перамераць».

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск	4.38	21.40	17.02
Віцебск	4.20	21.38	17.18
Магілёў	4.28	21.30	17.02
Гомель	4.34	21.17	16.43
Гродна	4.55	21.53	16.58
Брэст	5.05	21.45	16.40

Месяц

Поўня 13 чэрвеня.
Месяц у сузор'і Скарпіёна.

Імяніны

Пр. *Алены, Васіля, Захара, Ігната, Мікіты, Паўла.*
К. *Дзіяны, Малгажаты, Маргарыты, Ануфрыя, Генрыха.*

Фота Валерыя КАВАЛЁНКА.

ЗАЎТРА



…у суседзяў

ВАРШАВА	+23..+25°С	КІЕЎ	+20..+22°С	РЫГА	+19..+21°С
ВІЛЬНЮС	+22..+24°С	МАСКВА	+19..+21°С	С.-ПЕЦЯРБУРГ	+19..+21°С

УСМІХНЕМСЯ

Зразумеў, што мой узровень ляноты яшчэ не дасягнуў мяжы, калі ўбачыў, што нехта выгульваў сабаку на ланцужку праз акно першага паверха…

Усё ж такі добра, калі ў сям'і ёсць агульныя інтарэсы. Ён любіць рыбалку, а яна — калі ён на рыбалцы.

— Чытаў «Стары і мора»?
— А хто не чытаў!
— А ты чытаў?
— Гэта ж школьная праграма!
— Значыць, чытаў?
— Гэта ж класіка!
— Чытаў ці не?— Не.

Моня падарыў тату на яго дзень нараджэння самаробную паштоўку і атрымаў ад яго на свой дзень нараджэння самаробны iPhone.

caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гомелі: 43 25 29, Гродне: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, *e-mail: reklama@zviazda.by*

(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень. Тыраж 20.661. Індэкс 63850. Зак. № 2445.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 9 чэрвеня 2014 года.